Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 МАЯ 2015 г. АЎТОРАК № 87 (27945) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Балонскі працэс. Заяўка ад Беларусі**

СТАР. 5



**Плаціць… Навошта пераплачваць?**

СТАР. 7



**У падарожжа — з кітамі**

СТАР. 11

# ПАЗІЦЫІ СУПАДАЮЦЬ

## Беларусь і Кітай маюць аднолькавыя погляды і на развіццё эканамічнага супрацоўніцтва, і на ацэнку падзей гісторыі

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Старшыня Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпін, які знаходзіцца ў нашай краіне з дзяржаўным візітам, прынялі ўдзел у Беларуска-кітайскім бізнес-форуме і наведалі Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**



Фота БЕЛТА.

**Падчас наведвання музея Старшыня КНР узнагародзіў 15 беларускіх ветэранаў, якія ўдзельнічалі ў баях з японскімі агрэсарамі ў канцы Другой сусветнай вайны, медалём Міру. «Вы зрабілі вялікі ўклад у справу барацьбы з фашызмам. Вы з'яўляліся цвёрдымі абаронцамі міру на Зямлі», — сказаў кітайскі лідар, звяртаючыся да ветэранаў.**

Беларуска-кітайскі міжрэгіянальны бізнес-форум праходзіў у такім маштабе ўпершыню. Як адзначыў, выступаючы на мерапрыемстве, Аляксандр Лукашэнка, гэта сведчанне новага ўзроўню двухбаковых адносінаў, заснаваных на шматпланавым стратэгічным партнёрстве. «На сучасным этапе непасрэднае ўзаемадзеянне паміж рэгіёнамі і прадпрыемствамі павінна стаць вядучай рухаючай сілай чалавечага і дзелавога супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі», — лічыць беларускі лідар. Паводле слоў Прэзідэнта, у рэгіянальным узаемадзеянні ў першую чаргу патрэбна рэалізацыя інвестыцыйных праектаў у самых розных галінах. Ён звярнуў асаблівую ўвагу на тое, што цяпер у Беларусі створаны ўнікальныя ўмовы для інвесціравання.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, адкрыўшы вытворчасці ў Беларусі, кітайскі бізнес зможа карыстацца бесперашкодным выхадам на рынак Еўразійскага эканамічнага саюза. «Калі гаварыць шчыра, Кітайская Народная Рэспубліка і без Беларусі можа выйсці на вялікі еўразійскі саюз у плане эканомікі, але вось супрацоўнічаць з Еўрапейскім саюзам (без чаго Кітайская Народная Рэспубліка ўжо сёння не можа), а ў перспектыве як вызначальны фактар сусветнага развіцця такая пляцоўка для КНР выключна выгадная. І ў яе якасці выступае наша Беларусь», — сказаў Прэзідэнт.

«Кітайскія інвестары змогуць пераканацца на сваім вопыце ў тым, што працаваць у Беларусі камфортна і выгадна», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «А кіраўнікі дзвюх краін будуць іх у гэтым падтрымліваць», — падкрэсліў ён.

Прэзідэнт выказаў удзячнасць Сі Цзіньпіну за асабістае садзейнічанне ў паездцы такой прадстаўнічай дэлегацыі дзелавых колаў Кітая ў Беларусь. «Хачу вас запэўніць, што мы зробім усё, каб вы ніколі не пашкадавалі, што прыехалі ў нашу краіну. Мы зробім усё неабходнае, каб вы маглі вельмі эфектыўна пашыраць свае інтарэсы ў Еўропе», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

На форуме старшыня КНР Сі Цзіньпін агучыў некалькі прапаноў, якія павінны пасадзейнічаць умацаванню сувязяў паміж рэгіёнамі. Адна з іх заключаецца ў тым, каб палепшыць бізнес-клімат шляхам спрашчэння працэдуры рэгістрацыі прадпрыемстваў, прадастаўлення падатковых ільгот. Акрамя таго, бакам важна развіваць вытворчую кааперацыю. Старшыня КНР адзначыў, што кітайскі бок гатовы падзяліцца з беларускім перадавымі тэхналогіямі ў такіх сферах як чыгунка, сувязь.

Сі Цзіньпін звярнуў увагу, што беларуска-кітайскі тавараабарот расце паскоранымі тэмпамі, нягледзячы на складаныя знешнія ўмовы — спад сусветнай эканомікі, напружанае становішча ў рэгіёне. Старшыня КНР заклікаў прысутных на форуме кітайскіх бізнесменаў скарыстацца магчымасцю і вывучыць перспектывы ўзаемадзеяння з беларускімі партнёрамі. Ён выказаў упэўненасць, што дзякуючы актыўнаму ўдзелу рэгіёнаў беларуска-кітайскія адносіны ўзнімуцца на новы ўзровень.

СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай САМАСЕЙКА, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па міжнародных справах:**

*«Зыходзячы са шматвектарнасці знешняй палітыкі Беларусі, для нас важныя розныя палітычныя і эканамічныя кантакты. Адным з найважнейшых стратэгічных партнёраў з'яўляецца Кітайская Народная Рэспубліка. Нашы дыпламатычныя адносіны наладжаны больш за 20 гадоў таму, і зараз, дзякуючы візіту кітайскага лідара Сі Цзіньпіна, дружба і супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Кітаем не толькі пацвердзілі сваю трываласць, але і атрымалі развіццё: падчас візіту дасягнуты важныя дамоўленасці і падпісаны адпаведныя дакументы. Адметна, што кітайская дэлегацыя на чале са Старшынёй КНР знаходзіцца ў Беларусі ў дні святкавання Вялікай Перамогі. Нашы краіны агульнымі намаганнямі аберагаюць вынікі Другой сусветнай вайны, выступаюць супраць спроб іх перагляду і шануюць памяць загінулых».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.05.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14320,00 | ▲ |
| Еўра | 15990,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 281,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 681,90 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# УСЯ ПЯШЧОТА МАЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ПАЗІЦЫІ СУПАДАЮЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Падчас наведвання Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны лідары дзвюх краін яшчэ раз падкрэслілі неабходнасць захоўваць гістарычную праўду і супрацьстаяць спробам фальсіфікацыі гісторыі. Прэзідэнт Беларусі лічыць, што сёння, калі міжнародная супольнасць перажывае складаны крызісны час, гістарычная памяць і адзінства набываюць асаблівую каштоўнасць. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў музеі ёсць асобная экспазіцыя «Беларусь і Кітай. Вехі баявога братэрства», якая расказвае пра ўзаемадзеянне Народна-вызваленчай арміі Кітая і Чырвонай Арміі. Ён адзначыў, што кітайцы таксама ўдзельнічалі ў антыфашысцкім руху ў Віцебску.

Прэзідэнт Беларусі таксама паведаміў, што Старшыня КНР Сі Цзіньпін прыняў рашэнне маштабна адсвяткаваць у гэтым годзе 70-гадовы юбілей Перамогі. «Гэта вялікі залог таго, што гісторыя ніколі не будзе фальсіфікавана, а ваш подзвіг ніколі не будзе забыты», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да прысутных ветэранаў.

Старшыня КНР прызнаўся, што наведванне музея яго вельмі глыбока ўразіла. «Перад тварам страшэннай у гісторыі чалавецтва вайны беларускі народ праявіў вялікую мужнасць. Стойка прымаў на сябе першы ўдар вайны. Сваім жыццём і крывёй беларусы адстаялі годнасць і незалежнасць свайго народа і дзяржавы. Менавіта сваім гераізмам беларускі народ заваяваў павагу і прызнанне народаў усяго свету», — сказаў Старшыня КНР.

Ён зрабіў акцэнт на тым, што ў гады сумеснай барацьбы з агрэсарамі народы абедзвюх краін ваявалі плячо ў плячо. «Менавіта ў гэтыя гады крывёй было змацавана баявое сяброўства. Беларусы ў складзе Савецкай Арміі ваявалі з японскімі агрэсарамі падчас паветраных баёў, а таксама баявых аперацый на паўночным усходзе нашай краіны. Яны паскорылі разгром японскага мілітарызму. Нізкі вам паклон!» — сказаў Сі Цзіньпін.

Кітайскі лідар поўнасцю згодны з пазіцыяй Аляксандра Лукашэнкі наконт таго, што нельга дапускаць спробы фальсіфікацыі гісторыі Другой сусветнай вайны, гераізацыі фашыстаў. «Мы гатовы з усімі народамі, у тым ліку з беларускім, сумеснымі намаганнямі адстаяць вынікі нашай перамогі ў Другой сусветнай вайне», — заявіў ён.

# 3,5 млрд долараў за адзін дзень

**Менавіта на такую суму Беларусь і Кітай падпісалі 10 мая пагадненні і мемарандумы. Пра гэта на сустрэчы са Старшынёй Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпінам паведаміў прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ.**

«Толькі за адзін дзень падпісаны мемарандумы і пагадненні па крэдытна-інвестыцыйным супрацоўніцтве на агульную суму ў 3,5 млрд долараў», — сказаў кіраўнік урада.

Ён падзякаваў за крэдытныя рэсурсы, якія гатовы прадаставіць кітайскі бок. Прэм'ер-міністр удакладніў, што аб'ём крэдытаў дасягае 7 млрд долараў, у тым ліку 3 млрд складуць ільготныя сродкі.

Акрамя таго, як паведамляе БЕЛТА, Андрэй Кабякоў выказаў асаблівую падзяку кітайскаму лідару за рашэнне аб выдзяленні Беларусі тэхніка-эканамічнай дапамогі ў памеры 800 млн юаняў на рэалізацыю сацыяльных праектаў.

# Гістарычны поспех

**«Беларусь ганарыцца сваімі адносінамі з Кітаем. Цяперашні візіт у нашу краіну мы ацэньваем як гістарычны і вельмі паспяховы — падпісаныя ўчора дакументы адкрываюць новы этап беларуска-кітайскіх адносінаў», — заявіў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл Мясніковіч на сустрэчы са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам.**

Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што Беларусь шмат чаму вучыцца ў кітайскіх партнёраў. «Мы імкнёмся пераймаць ваш вопыт. Кожная краіна мае свае асаблівасці, але ў нас шмат агульнага ў прынцыповых падыходах развіцця», — канстатаваў кіраўнік палаты парламента.

За больш чым 20-гадовы перыяд дыпламатычных адносінаў тавараабарот Беларусі і Кітая вырас у сто разоў. Па звестках Мінэканомікі, за мінулы год прырост тавараабароту дзвюх краін павялічыўся на 27%.

■ Парламенцкі дзённік

# «ВАША КРАІНА МОЖА СЛУЖЫЦЬ ДОБРЫМ ПРЫКЛАДАМ ДЛЯ НАС»

**Па запрашэнні нашага парламента Беларусь наведала дэлегацыя Генеральнага кангрэса Мексікі. Дэпутаты пазнаёміліся з працай некалькіх сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, а таксама прынялі ўдзел ва ўрачыстасцях, прысвечаных Дню Перамогі. Учора адбылася сустрэча мексіканскай дэлегацыі з беларускімі парламентарыямі.**

Кіраўнік дэлегацыі **Магдалена дэль Сакора Нуньес Манрэаль, старшыня групы сяброўства «Мексіка — Беларусь» Палаты дэпутатаў Генеральнага кангрэса Мексіканскіх Злучаных Штатаў**, у размове з журналістамі падкрэсліла, што гэты візіт — першы з таго моманту, калі ў мексіканскім парламенце была створана група сяброўства «Беларусь — Мексіка».

— Галоўная мэта візіту — умацаваць сувязі паміж нашымі парламенцкімі групамі сяброўства, — адзначыла мексіканскі парламентарый. — Акрамя гэтага, умацаванне нашых узаемаадносін у сферах эканомікі, палітыкі і сацыяльнай сферы.

Адказваючы на пытанне наконт магчымых праектаў паміж Мексікай і Беларуссю ў розных сферах, Магдалена дэль Сакора Нуньес Манрэаль заўважыла, што трэба шмат чаго зрабіць для развіцця нашых эканамічных сувязяў. Яна таксама праінфармавала: у хуткім часе плануецца назначэнне Ганаровага консула Мексікі ў Беларусі.

— Мы бачым вельмі вялікі патэнцыял у эканамічным супрацоўніцтве паміж нашымі краінамі. Нам вельмі спадабаліся ўзоры беларускай прамысловасці, яны ўяўляюць цікавасць для развіцця аграрнага сектара нашай краіны.

Мексіканскі парламентарый таксама падзялілася ўражаннямі ад наведвання Беларусі.

— Нам пашчасціла прымаць удзел ва ўрачыстасцях, прымеркаваных да 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, — паведаміла яна. — Тое, як краіна была адноўлена пасля той страшнай вайны, сапраўды ўражвае. Мы адзначылі для сябе сур'ёзныя дасягненні Беларусі ў галіне сельскай гаспадаркі. Для нашай краіны Беларусь можа служыць добрым прыкладам: мы бачым, які нізкі тут узровень беспрацоўя, як арганізавана сістэма сацыяльнай абароны насельніцтва — тут мы сапраўды можам наладзіць сацыяльную роўнасць. Для нас гэта важна і цікава з той прычыны, што мы прыехалі адтуль, дзе, на жаль, і сёння маюць месца з'явы сацыяльнай няроўнасці і многія іншыя сацыяльныя праблемы.

У сваю чаргу **Аляксей Кузьміч, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве, кіраўнік працоўнай групы Нацыянальнага сходу па супрацоўніцтве з парламентам Мексікі**, акцэнтаваў увагу на тым, што гэтая краіна ўяўляе цікавасць для Беларусі і ў палітычным, і ў эканамічным планах. Ён падкрэсліў парламентарый, у Мексіцы пражывае 120 мільёнаў чалавек, і гэта робіць краіну асабліва перспектыўным партнёрам.

— Пакуль на ўзроўні парламенцкіх арганізацый Беларусь і Мексіка не супрацоўнічалі, — канстатаваў Аляксей Кузьміч. — Гэта толькі першы візіт парламенцкай дэлегацыі. Мы накіравалі туды запрашэнне, і мексіканскія дэпутаты адгукнуліся.

* * *

*Мексіка — краіна, якая па аб'ёме ВУП займае 11 месца ў свеце. Гэта адна з найбольш развітых дзяржаў рэгіёна. У Мексіцы здабываюць нафту, прыродны газ, жалезную руду, серу, ртуць, графіт. Добра развіты такія сферы прамысловасці, як хімічная і нафтахімічная, бавоўняная і харчовая, чорная і каляровая металургія, машынабудаванне. У той жа час нафтаперапрацоўка ў краіне развіта слаба: з'яўляючыся адным з найбуйнейшых сусветных экспарцёраў нафты, Мексіка імпартуе вытворныя з «чорнага золата». З гэтай прычыны супрацоўніцтва з краінай у галіне нафтаперапрацоўкі ўяўляе для нашай дзяржавы асаблівую цікавасць.*

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

# Народная дыпламатыя як рухавік эканомікі

**Беларуска-кітайскі міжрэгіянальны бізнес-форум, арганізаваны Міністэрствам эканомікі Рэспублікі Беларусь, Беларускай гандлёва-прамысловай палатай і Міністэрствам камерцыі КНР, выразна акрэсліў новы этап у развіцці беларуска-кітайскіх адносінаў.**




Усебаковае стратэгічнае партнёрства такога ўзроўню, які зараз складваецца ў зносінах Беларусі і Кітая, магчыма пры наяўнасці цэлага шэрагу прычын. Але першым у гэтым радзе з'яўляецца характар адносінаў кіраўнікоў краін — Сі Цзіньпіна і Аляксандра Лукашэнкі. Гэта — навідавоку і не патрабуе ніякай аргументацыі. Ды і маштаб форуму ўражвае: 450 удзельнікаў, прадстаўнічыя дэлегацыі рэгіёнаў Беларусі і Кітая.

Старшыня КНР Сі Цзіньпін, выступаючы на адкрыцці форуму, узгадаў кітайскую прымаўку: «Полымя разгараецца тады, калі ўсе ідуць па дровы». І дадаў, што ўзровень двухбаковых адносінаў залежыць ад блізкасці двух народаў. Кітайскі лідар, заўважыўшы, што нашымі краінамі супольна ўжо шмат зроблена, звярнуў увагу на тры істотныя акалічнасці. Па-першае, на яго думку, паляпшэнне бізнес-клімату павысіць узровень адкрытасці, умацуе патэнцыял для вытворчай кааперацыі, прыцягне замежныя інвестыцыі, спросціць парадак рэгістрацыі прадпрыемстваў. Па-другое, кітайскі бок гатовы падзяліцца вытворчымі магутнасцямі і перадавымі тэхналогіямі. Час паказаў, што выдатнай пляцоўкай для рэалізацыі гэтай устаноўкі з'яўляецца праект беларуска-кітайскага індустрыяльнага парка. І ўвогуле, Беларусь валодае моцнай вытворчай базай. Сі Цзіньпін нагадаў словы Аляксандра Лукашэнкі пра знаходжанне нашай краіны ў цэнтры Еўропы, якраз на Вялікім шаўковым шляху, на той дарозе, якую гатовы будаваць Кітай сёння па прасоўванні, рэалізацыі сваіх тавараў. Па-трэцяе, высокі госць падкрэсліў гэта асабліва, абедзвюм краінам у сваім цесным супрацоўніцтве варта ўмацоўваць фінансава-крэдытную палітыку. Трэба дапамагчы малому і сярэдняму бізнесу. Выказаў Сі Цзіньпін і спадзяванні на большую актыўнасць Банка развіцця.

І ў выступленні Аляксандра Лукашэнкі, і ў дакладах шырокага кола ўдзельнікаў форуму не аднойчы гучала думка пра тое, што Беларусь — ярка выражаны партнёр Кітая не толькі па прасоўванні тавараў у мытнай прасторы Еўразійскага эканамічнага саюза. Але — і на шляху да краін Еўрасаюза, што адыгрывае асаблівую ролю. Вядома, важнае значэнне мае геаграфічнае становішча Беларусі. Але не менш істотным з'яўляецца і памкненні краіны да фарміравання добразычлівых, прыязных адносінаў з усім навакольным светам.

Развіццё Кітая ўражвае і натхняе на тое, каб цягнуцца да яго хуткасцей і яго арганізаванасці. Кіраўнікі перадавых прадпрыемстваў, вертыкаль улады ў Беларусі, бізнес-супольнасць краіны — усе разумеюць гэта і стараюцца праектаваць развагі і ўяўленні ў канкрэтныя справы. Міншчына, Гродзеншчына, Магілёўшчына, Мінск і іншыя рэгіёны — усе маюць партнёраў у Кітаі, падпісалі пагадненні аб супрацоўніцтве. Беларуска-кітайскія адносіны насычаюцца канкрэтыкай. І, зразумела, спрыяе гэтаму «адкрыццё» Кітая, пашырэнне ведаў пра далёкую па адлегласці, але ўжо такую блізкую з пункту гледжання стасункаў краіну. І хаця на форуме не гучалі словы пра народную дыпламатыю, менавіта яна, разуменне адносінаў паміж беларусамі і кітайцамі як добрымі, шчырымі сябрамі — аснова руху наперад, складання і рэалізацыі розных, часам даволі няпростых сумесных планаў.

**Сяргей ШЫЧКО.**

**P.S.** *Па выніках форуму адразу было падпісана 25 дагавораў.*

# Памяць пра ветэранаў

## Супрацоўнікі органаў унутраных спраў наведалі і павіншавалі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны

**Як паведамілі ў МУС, на ўліку ў ветэранскіх арганізацый ведамства знаходзяцца 344 удзельнікі вайны. Многія з іх — уладальнікі шматлікіх баявых узнагарод. Разам з віншаваннямі і падарункамі кожны з іх атрымаў юбілейны медаль «70 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў».**

Акрамя таго, ветэраны на чале з Віктарам Піскаровым, старшынёй Рэспубліканскага савета ветэранаў МУС, наведалі магілы загінулых партызанаў, франтавікоў, якія займалі высокія пасады ў беларускай і савецкай міліцыі, — Героя Савецкага Саюза Сяргея Сікорскага, Аляксея Клімоўскага, Васіля Цімашэнкі, Аляксандра Аксёнава і іншых.

Да Дня Перамогі ў міністэрстве таксама прымеркавалі сустрэчу **міністра Ігара ШУНЕВІЧА** з маладымі супрацоўнікамі міліцыі, якія прыехалі ў Мінск з усіх куткоў краіны. Праваахоўнікі на тэрыторыі Цэнтра павышэння кваліфікацыі кіраўнічых работнікаў і спецыялістаў Дэпартамента аховы заклалі хваёвую алею ў гонар 70-годдзя перамогі, устанавілі памятны знак, паўдзельнічалі разам з ветэранамі ў круглым стале, наведалі мемарыяльны комплекс «Хатынь»...

— Нашым дзядам і прадзедам пашанцавала — яны засталіся жывыя, — звярнуўся да моладзі Ігар Шуневіч. — Таму мы з вамі і нарадзіліся. Аднак кожны трэці беларус не вярнуўся з той жорсткай вайны. Я хачу, каб мы заўжды помнілі адну рэч: калі ў чыюсьці галаву прыйдзе недарэчная ідэя зладзіць нешта падобнае да таго, што адбылося 70 гадоў таму, у краіны ёсць мы з вамі, людзі ў пагонах, якія павінны выканаць свой абавязак.

**Якаў ЖУРБІН.**

■ Надвор'е

# ПАХАЛАДАЕ І ДАЖДЖЫ

## А ў пятніцу ўначы магчымы нават замаразкі да мінус 3

**Сёння на тэрыторыі нашай краіны захаваецца павышаны фон атмасфернага ціску, таму істотных ападкаў не будзе, пра што паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**



Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 17-23 цяпла. Аднак ужо ў сераду характар надвор'я зменіцца, бо да нас пачне паступаць актыўная паветраная маса з боку Атлантыкі. Таму чакаецца воблачна з праясненнямі, уначы на 13 мая на захадзе краіны, а ўдзень паўсюдна пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі з навальніцамі. Удзень прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15-17 м/с. Тэмпература паветра ўначы на сераду — ад плюс 5 градусаў па ўсходзе, да 13 цяпла па захадзе краіны.

Адразу на 5 градусаў пахаладае і ўдзень, калі чакаецца толькі 11-18 цяпла, па паўднёвым усходзе — плюс 19-23 градусы. Халаднавата будзе і ў чацвер, калі ўначы месцамі, а ўдзень у многіх раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы. Удзень у асобных раёнах навальніцы. Тэмпература паветра ўначы на чацвер складзе 3-8 цяпла, а ўдзень — плюс 12-19 градусаў.

Самае сур'ёзнае пахаладанне на тыдні прагназуецца ў пятніцу. У гэты дзень кароткачасовыя дажджы чакаюцца паўсюдна па краіне. Тэмпература паветра ўначы на пятніцу складзе 2-8 цяпла, а па захадзе краіны магчымы нават замаразкі да мінус 3 градусаў. Удзень будзе ад 11 да 17 цяпла, па поўдні — да плюс 19 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Факт

# КОЛЬКАСЦЬ ПРАЦОЎНЫХ МІГРАНТАЎ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА

**Пра гэта падчас міжнароднай сустрэчы экспертаў па пытаннях працоўнай міграцыі ў Мінску паведаміў Аляксандр Татура, намеснік начальніка Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Рэспублікі Беларусь.**

— Мы назіраем істотнае павелічэнне колькасці замежных грамадзян, якія для працы ўязджаюць на тэрыторыю нашай краіны. Лічбы кажуць самі за сябе. За апошнія два гады ў Беларусі адбылося іх трохразовае павелічэнне.

Аляксандр Татура таксама заўважыў, што падзеі ва Украіне паўплывалі на сітуацыю на беларускім рынку працы. Агулам летась працаваць у Беларусь прыехала каля 40 тысяч чалавек. З іх 13,5 тысячы — грамадзяне Украіны. Аднак «органы дзяржаўнага кіравання, унутраных спраў трымаюць сітуацыю пад кантролем, і павелічэнне колькасці замежнікаў, якія прыехалі працаваць, не стварае напружанасці ў крымінальнай сферы».

Канстанцін Шалькевіч, начальнік упраўлення і грамадскіх сувязяў МУС, адзначыў, што мерапрыемства з удзелам групы спецыялістаў Панэлі па пытаннях міграцыі і прытулку Усходняга партнёрства праводзіцца па ініцыятыве Генеральнага дырэктарата ўнутраных спраў Еўрапейскай камісіі пры падтрымцы МУС Беларусі, Латвіі і шведскай міграцыйнай службы. Удзельнікі абмяркуюць пытанні кіравання працоўнай міграцыяй, наведаюць упраўленне па грамадзянстве і міграцыі ГУУС Мінгарвыканкама... Дэлегацыю МУС узначальвае намеснік міністра ўнутраных спраў Мікалай Мельчанка.



**Тарас ШЧЫРЫ**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

### СВЯТКАВАЛІ ПЕРАМОГУ РАЗАМ

**У сталіцы ва ўрачыстасцях на Дзень Перамогі ўзяло ўдзел больш за мільён чалавек.**

Разнастайныя святочныя мерапрыемствы, прымеркаваныя да 70-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, праходзілі з 9.00 да 23.00 на многіх мінскіх пляцоўках. Па ацэнках ГУУС Мінгарвыканкама, у сталіцы ва ўсіх агульнарэспубліканскіх, гарадскіх і раённых урачыстасцях і святочных грамадска-масавых мерапрыемствах узяло ўдзел больш за мільён чалавек. Ахову грамадскага парадку вялі супрацоўнікі міліцыі і вайскоўцы ўнутраных войск. Усе задачы па забеспячэнні правапарадку імі выкананы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### СЕРБСКАЯ ПАМЯЦЬ ПРА ВЯЛІКУЮ АЙЧЫННУЮ

**Ураджэнец Бабруйска капітан Уладзімір Гушча геройскі загінуў у Югаславіі ў 1945-м.**

Пахаваны наш зямляк у горадзе Срэмска Мітровіца (гэта — аўтаномны край Ваяводзіна). Паслы Беларусі і Расіі ў Сербіі Уладзімір Чушаў і Аляксандр Чапурын у сувязі з 70-годдзем Вялікай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне ўсклалі вянкі да абеліска ў гонар легендарнага лётчыка, кавалера многіх баявых ордэнаў, а таксама — на брацкую магілу савецкіх ваенных лётчыкаў.

Аддалі даніну павагі расійскі і беларускі дыпламаты, а таксама намеснік дырэктара дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання Агульнанацыянальнага тэлебачання Тэнгіз Думбадзэ (Мінск) і памяці героя-чырвонаармейца Міхаіла Галанава ў вёсцы Стара Бінгула Уладзімір Чушаў і Аляксандр Чапурын наведалі і мясцовую школу, дзе прынялі ўдзел у святочных мерапрыемствах да юбілею агульнай перамогі над фашызмам.

**Сяргей ШЫЧКО.**

### ПАЧЫНАЕЦЦА ПАЛЯВАННЕ НА КАЗУЛЮ

**З 15 мая ў краіне адкрываецца сезон палявання на казулю. Ён будзе доўжыцца па 30 верасня.**

— Здабываць можна будзе дарослых самцоў, селекцыйных жывёл любога полу і ўзросту, — распавёў «Звяздзе» старшы дзяржаўны інспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і раслиннага свету Вадзім Варабей. — Паляванне дазваляецца зброевым спосабам з засады, з падыходу цягам сутак. Можна выкарыстоўваць наступныя прылады палявання: наразную паляўнічую зброю з дульнай энергіяй кулі звыш 1 500 джоўлей, гладкаствольную паляўнічую зброю з выкарыстаннем патронаў з куляй ці карцеччу, паляўнічыя лукі і арбалеты.

За парушэнне Правіл вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання можна атрымаць штраф у памеры ад 20 да 50 базавых велічынь з канфіскацыяй зброі, іншых прылад палявання і прадметаў, якія сталі прыладамі ці сродкам здзяйснення парушэння, ці без канфіскацыі і з пазбаўленнем спецыяльнага права на паляванне.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### СУТКІ ЦВЯРОЗАСЦІ

**У дні правядзення ў сталічных школах апошніх званкоў і выпускных вечароў у Мінску абмяжуюць продаж алкаголю і піва.**

Абмежаванні будуць дзейнічаць на працягу сутак 30 мая і 12 чэрвеня. У гэты час у крамах будзе забаронена прадаваць гарэлку, лікёра-гарэлачныя вырабы, віно, каньяк, брэндзі, шампанскае і іншыя напоі, якія ўтрымліваюць 7% і больш этылавага спірту. Выключэнне будзе зроблена толькі для аб'ектаў грамадскага харчавання. Як гаворыцца ў афіцыйным паведамленні Мінгарвыканкама, прычына такога рашэння — «неабходнасць забеспячэння грамадскага парадку і стварэння бяспечных умоў знаходжання навучэнцаў у месцах правядзення апошніх званкоў і выпускных вечароў».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### ЗАТРЫМАЎ ЗЛОДЗЕЯ

**У Лунінцы намеснік начальніка райаддзела МНС затрымаў злодзея.**

Эдуард Санюковіч толькі выйшаў са свайго аўтамабіля на вуліцы Лісовіча, як міма прабег мужчына. Ад яго значна адставала жанчына, але жэстамі паказала, што трэба спыніць уцекача. Работнік МНС дагнаў мужчыну, затрымаў яго і перадаў супрацоўнікам міліцыі. Як паведамілі ў Брэсцкім абласным упраўленні МНС, паводле папярэдняй версіі, непрацуючы грамадзянін здзейсніў крадзеж з магазіна. А першы намеснік начальніка Лунінецкага райаддзела МНС у вольны ад службы час дапамог затрымаць зламысніка.

**Яна СВЕТАВА.**

### ХТО ЗНЁС «ВІНІ ПУХА»?

**У сталічным гандлёвым цэнтры скралі дзіцячы зоамабіль «Віні Пух». «Згоншчыкам» цацачнага сродку перамяшчэння ў выглядзе мядзведзя аказаўся хлопец.**

Як паведамілі ў РУУС Фрунзенскага раёна, інцыдэнт адбыўся 6 мая ў гандлёвым цэнтры на вуліцы Каменнагорскай. Камеры відэаназірання зафіксавалі даволі цікавы выпадак. Звычайна згоншчыкі з'язджаюць на скрадзеным аўто, а ў гэтым выпадку хлопец у сінім спартыўным касцюме вырашыў пакінуць краму на... дзіцячым электрамабілі ў выглядзе медзведзяняці. «Кіроўца» спачатку пакатаўся на ім па фае, накіраваўся да выхаду, а пасля — знік у невядомым напрамку. Падобны зоамабіль каштуе каля 15 мільёнаў рублёў. На момант падпісання нумара ў друк злачынцу яшчэ не знайшлі.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

■ На вялікім экране

# ТУЗІН ЕЎРАПЕЙСКАГА КІНО

**Учора ў сталічным кінатэатры «Перамога» адкрыўся прымеркаваны да Дня Еўропы Фестываль сучаснага еўрапейскага кіно. На працягу тыдня адбудзецца дванаццаць паказаў поўнаметражных і кароткаметражных фільмаў. Арганізатарамі фестывалю сталі Прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі і амбасады краін ЕС.**

Адкрыўся фестываль двума фільмамі — літоўскай стужкай 2013 года «Гулец» Ігнаса Ёнінаса і беларускай карцінай Аляксандры Бутар (рэжысёра рэмейка «Белых рос») «Салодкае развітанне Веры», якую глядач пакуль не меў магчымасці ўбачыць у кінапракаце. Атрымаўся своеасаблівы літоўска-беларускі вечар, таму што выканаўцамі галоўных роляў у «Салодкім развітанні» з'яўляюцца літоўскія акцёры Юозас Будрайціс і Нэле Савічанка-Кліменэ, якія разам з рэжысёрам прадставілі стужку.

Сёння а палове сёмай вечара можна будзе ўбачыць калекцыю кароткіх галандскіх фільмаў, а дзявятай — румынскую карціну Люсіана Георгеску «Прывід бацькі».

З заўтрашняга дня праграма фестывалю ўключае польскі фільм Лукаша Палкоўскі «Богі», чэшскі «Цёмна-сіні свет» Яна Сверака, стужку італьянца Джані Амеліа «Бясстрашны», нямецкую карціну «Мост праз Ібар» Міхаэла Казеле, фінляндскую рэжысёра Доме Карукоскі «Пакрыўджаны», дацкую карціну «Жонка мастака» Біле Аўгуста, французскую «Сям'я на траіх» Жака Дуайона і шведскую «Эга» Лайза Джэймс-Ларсана.



**Кадр з фільма Аляксандры Бутар «Салодкае развітанне Веры».**

Дзень Еўропы адзначаецца 9 мая — у гэты дзень 1950 года міністр замежных спраў Францыі Роберт Шуман агучыў свае прапановы, якія сёння мы называем Дэкларацыяй Шумана. Гэта стала пачаткам гісторыі Еўрапейскага Саюза, а 9 мая — святам і прычынай для ўрачыстасцяў.

Мы можам далучыцца да святкавання разам з кіно. Калі ў мінулым годзе фестываль атрымаўся тэматычным (паказваліся фільмы на тэму Першай сусветнай вайны ў адказ на стагоддзе з яе пачатку), то на гэты раз галоўным крытэрыем адбору фільмаў была іх сучаснасць — фестываль пакажа адны з самых цікавых стужак за апошнія два-тры гады.

Уваход на паказы, якія будуць адбывацца кожны вечар тыдня ў кінатэатры «Перамога», вольны.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

20 мая 2015 г. в 10.00. состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестская передвижная механизированная колонна №1».

Повестка дня:

1. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Брестская передвижная механизированная колонна №1»: г. Брест, ул. Белорусская, 51.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Белорусская, 51.

Время регистрации в день проведения собрания с 09.30 до 10.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 13.05.2015 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНН 200215539 Совет директоров.

22 мая 2015 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1) О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 15.05.2015 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНП 200050191 Совет директоров.

**Открытое акционерное общество**

**«Дорожно-строительный трест № 3»**

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, которое состоится 22 мая 2015 года в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О внесении изменений в Устав ОАО «ДСТ № 3»

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться 22.05.2015 г. с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 15.05.2015 г.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с материалами к собранию по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 33.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров — доверенности, зарегистрированные в соответствии с действующим законодательством).

Справки по телефонам: 28-40-20, 23-64-87 — Отдел правовой и кадровой работы, Наблюдательный совет. УНП 700049607

■ Меркаванне

# КРЭМАЦЫЯ НЕ АДОБРАНА

**У Рускай праваслаўнай царкве вызначылі сваё стаўленне да крэмацыі цел памерлых. Гэтае пытанне ў ліку іншых было разгледжана падчас першага ў 2015 годзе пасяджэння Святога Сінода пад старшынствам Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла.**

Пытанне пра крэмацыю было ўпершыню пастаўлена перад камісіяй па царкоўным праве яшчэ ў 2009 годзе. У верасні 2013-га падрыхтаваны камісіяй дакумент "Аб хрысціянскім пахаванні памерлых" быў разасланы для водгуку ў епархіі і апублікаваны для правядзення адкрытай дыскусіі. На пасяджэнні Сінода ён быў зацверджаны.

«Улічваючы старажытную традыцыю, поўную глыбокай пашаны да цела хрысціяніна як да храма Духа Святога, Святы Сінод прызнае нормай пахаванне памерлых хрысціян у зямлі», — гаворыцца ў дакуменце.

Крэмацыю царква лічыць «з'явай непажаданай» і не ўхваляе яе. Разам з тым, яна «можа з разуменнем ставіцца да факта крэмацыі цела памерлага», калі пахаванне ў зямлі не прадугледжана мясцовым свецкім заканадаўствам або звязана з неабходнасцю транспартаваць памерлага на вялікія адлегласці ці немагчыма па іншых аб'ектыўных прычынах. Пасля крэмацыі прах павінен быць аддадзены зямлі (падкрэсліваецца ў дакуменце).

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**

■ Блізкая ўлада

# УЗАКОНІЦЬ НЕЛЬГА. ЗНЕСЦІ!

**Большасць пытанняў, з якімі прыйшлі на прыём да старшыні Мінаблвыканкама Сямёна ШАПІРЫ жыхары Мінскага раёна, тычыліся будаўніцтва жылля.**



Фота БЕЛТА.

У прыватнасці прадстаўнікі жыллёва-будаўнічых вытворчых кааператываў «Бараўляны-2008» і «Дружны-2011» звярнуліся па фінансавую падтрымку. Кіраўнік цэнтральнага рэгіёна запэўніў заяўнікаў, што з цягам часу ўсе кааператывы, што ўзводзяцца на Міншчыне, будуць завершаны. Але пакуль такой магчымасці няма: вобласці выдаткавана амаль утрая менш сродкаў, чым неабходна для завяршэння будаўніцтва. Як патлумачыў старшыня камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Мінаблвыканкама Сяргей Трусаў, у Мінскай вобласці ў праграму фінансавання на гэты год уключаны 78 жыллёвых кааператываў, у пералік не ўвайшлі яшчэ 36 кааператываў. «У маі ўрад вяртаўся да разгляду гэтага пытання, але пакуль дадаткова фінансавання не прадугледжваецца», — растлумачыў спецыяліст.

Старшыня аблвыканкама нагадаў, што ў такіх пытаннях улады павінны сумленна інфармаваць людзей, а не даваць пустыя абяцанні. «Магчыма, гэтыя ЖБВК будуць уключаны ў праграму фінансавання на наступны год. Усё залежыць ад аб'ёму праграмы. Мы будзем думаць, як вырашыць пытанне, будзем прасіць урад аб фінансаванні», — канстатаваў Сямён Шапіра.

А вось са старшынёй кааператыва «Дружны-2007», якая папрасіла прымусіць будаўнікоў выправіць недаробкі, Сямён Шапіра пагадзіўся.

Яшчэ адзін заяўнік папрасіў пасадзейнічаць заасфальтаваць дарогу ад Ратамкі да садаводчага таварыства «Машынабудаўнік». Але Сямён Шапіра нагадаў, што работа са зваротамі грамадзян павінна будавацца на прынцыпе справядлівасці. У кожным раёне вызначана чарговасць будаўніцтва і ўладкавання дарог. Паводле гэтага графіка і ажыццяўляецца праца. «Вырашаць праблемы толькі тых людзей, што трапілі на прыём, няправільна. Для вывучэння стану дарог у кожным раёне створаны спецыяльныя камісіі, і я не маю права ўмешваца ў іх дзейнасць», — адзначыў ён.

Практычна на кожны прыём старшыні аблвыканкама прыходзяць грамадзяне з просьбай не зносіць, а даць магчымасць узаконіць самавольна ўзведзеныя пабудовы. Не стаў выключэннем і гэты прыём. Але адказ кіраўніка сталічнай вобласці быў аднназначны: «Усё, што пабудавана незаконна, трэба знесці. Інакш мы пакажам дрэнны прыклад людзям: спачатку можна пабудаваць, а потым займацца неабходнымі працэдурамі». Па словах Сямёна Шапіры, такія «самапалы» знойдзены ў лесапаркавай зоне паблізу Мінска. «Мы прыйшлі да высновы, што ўсё незаконна пабудаванае будзе знесена», — сказаў ён.

Не знайшла падтрымкі і жыхарка Мінскага раёна. Ёй выдзелілі ўчастак для ўзвядзення дома. Але яна хоча пабудаваць тут прыватны дзіцячы садок і просіць пасадзейнічаць у атрыманні крэдыту для гэтых мэт. Аднак паводле праграмы па падтрымцы малога і сярэдняга бізнесу дапамога ёй не прадугледжана. «Тут мы не можам дапамагчы: Мінаблвыканкам — не крэдытная арганізацыя», — сказаў Сямён Шапіра.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■ Погляд

# НАВІЧОК У ЕАЭС



**На фоне святкавання 70-гадовай гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і эпахальнага візіту Сінь Цзіньпіна ў Казахстан, Расію і Беларусь амаль не заўважным засталося дасягнутае пагадненне аб уступленні Кыргызстана ў Еўразійскі эканамічны саюз. Тым не менш, гэты важны крок быў зроблены, і ў ЕАЭС цяпер будзе пяць дзяржаў, а не чатыры.**

Пагадненне ўступіць у сілу пасля ратыфікацыі ўсімі пяццю парламентамі краін-удзельніц. Можна смела чакаць, што расійскі парламент ратыфікуе пагадненне адным з першых, паколькі ні для каго не з'яўляецца сакрэтам, што менавіта Расія прыкладала вялікія намаганні, каб далучыць Кыргызстан да ЕАЭС. Так, кіраўнік калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі Віктар Хрысценка разлічвае, што дакументы аб далучэнні Кыргызстана да ЕАЭС будуць ратыфікаваны расійскім парламентам ужо ў вясновую сесію.

Расійскі інтарэс у далучэнні Кыргызстана заключаецца перш за ўсё ў геапалітычнай значнасці краіны. І падагрэецца ён непрыкрытай цікавасцю да Кыргызстана з боку ЗША. У амерыканцаў нават атрымалася на працягу некалькіх гадоў мець сваю ваенную базу на яго тэрыторыі, канец чаму быў пакладзены ў выніку намаганняў Масквы.

Адразу пасля ратыфікацыі пагаднення будзе скасавана ўнутраная мытная мяжа Казахстана і Кыргызстана. Кантроль за імпартам у ЕАЭС пяройдзе на кыргызскую мяжу з Кітаем, Таджыкістанам і Узбекістанам. Каб ён ажыццяўляўся належным чынам, Расійская Федэрацыя ўжо выдаткавала 115 мільёнаў долараў на ўладкаванне мяжы, а з Казахстанам абмяркоўваецца дапамога на сто мільёнаў долараў ЗША.

Вядома, для беларусаў, перш за ўсё, цікава, чым Кыргызстан падобны і чым адрозніваецца ад нашай краіны.

Падобнай рысай Кыргызстана з'яўляецца адсутнасць выхаду да Сусветнага акіяна. Вядома, гэты факт сур'ёзна абцяжарвае працу абедзвюх эканомік у XXI стагоддзі, у якім Сусветны акіян прадстаўляе найлепшыя магчымасці для экспарту і імпарту тавараў, перш за ўсё краінам, што маюць да яго прамы выхад. Падобным з'яўляецца памер тэрыторыі. У Кыргызстана яна меншая за беларускую ўсяго на некалькі працэнтаў.

На гэтым падобныя моманты заканчваюцца. Разгледзім адрозненні.

Што тычыцца геаграфіі, то Беларусь вылучаецца раўнінным ландшафтам, у той час як Кыргызстан знакаміты сваімі горамі.

**Адразу пасля ратыфікацыі пагаднення будзе скасавана ўнутраная мытная мяжа Казахстана і Кыргызстана. Кантроль за імпартам у ЕАЭС пяройдзе на кыргызскую мяжу з Кітаем, Таджыкістанам і Узбекістанам.**

Насельніцтва Кыргызстана амаль у два разы меншае за беларускае — прыкладна пяць мільёнаў дзевяцьсот тысяч чалавек. Пры гэтым ацэнка дастаткова прыблізная, паколькі з прычыны высокага ўзроўню беспрацоўя вельмі шмат жыхароў Кыргызстана працуе за мяжой, у асноўным у Расіі. У выніку адным з галоўных крыніц паступлення валюты ў краіну з'яўляюцца пераводы ад мігрантаў, якія складаюць амаль два мільярды долараў у год.

Важным адрозненнем з'яўляецца экспартная арыентаванасць беларускай эканомікі, што лёгка адзначыць, параўнаўшы лічбы экспарту Беларусі і Кыргызстана за 2014 год. У мінулым годзе Кыргызстан экспартаваў тавары на 1 млрд 640,7 млн долараў, а Беларусь на 36 млрд 218,3 млн долараў. Таксама Беларусь утрымлівае адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі ў досыць невялікіх памерах. Што тычыцца Кыргызстана, то ў яго яно дасягае велізарных памераў, пераўзыходзячы памер усяго экспарту. Так, па выніках 2014 года адмоўнае сальда склала 4 мільярды 79 млн долараў. Калі разглядаць сам гандаль Беларусі з Кыргызстанам, то па выніках 2014 года яго аб'ём склаў крыху больш за 95 мільёнаў долараў, пры гэтым беларускі экспарт — 88,8 мільёна долараў ЗША.

Важным адрозненнем з'яўляецца таксама праблематычнасць у стабілізацыі сацыяльна-палітычнага жыцця ў Кыргызстане. Толькі ў XXI стагоддзі ў ім ужо адбыліся дзве паспяховыя рэвалюцыі (у 2005 і ў 2010 годзе), і прэзідэнты, якія страцілі ўладу, з'ехалі на сталае месца жыхарства ў Маскву і Мінск.

Што тычыцца асцярог з нагоды ўступлення Кыргызстана ў ЕАЭС у саміх жыхароў краіны, то ў асноўным яны звязаны са страхамі, што ў выніку інтэграцыі ўзровень цэн рэзка павысіцца і дасягне расійскіх і казахстанскіх. Гэтую боязь можна зразумець, улічваючы, што ўзровень жыцця ў краіне вельмі нізкі. ВУП на аднаго жыхара па парытэце пакупніцкай здольнасці складае ўсяго толькі 2372 долары ЗША, што прыкладна ў шэсць разоў менш, чым прыпадае на аднаго беларуса. Таксама ёсць вялікія асцярогі, што агульная мытная мяжа ўдарыць па знакамітых кірмашах на тэрыторыі Кыргызстана, якія кармілі да ста тысяч гандляроў. Яны сталі перавалачным пунктам для танных кітайскіх тавараў у краіны СНД, але могуць рэзка скараціць сваю дзейнасць праз павышэнне мытных пошлін да ўзроўню, які існуе ў ЕАЭС.

Калі ж казаць пра надзеі, то яны звязваюцца перш за ўсё з тым, што жыхарам Кыргызстана будзе значна лягчэй знайсці легальную працу за межамі краіны. Чакаецца, што ўзрасце паток інвестыцый у кыргызстанскую эканоміку, перш за ўсё з Расіі. Ёсць надзеі і на тое, што сяброўства ў ЕАЭС дапаможа аднавіць амаль разбураную навуковую сферу.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**

■ Прафсаюзны рух

# ЗА САЦЫЯЛЬНУЮ АРЫЕНТАВАНАСЦЬ

## 21-22 мая адбудзецца 7-ы з'езд Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі

**Зараз спецыяльная працоўная група рыхтуе праект праграмы дзейнасці прафсаюзаў на 2015-2020 гады, які ў найбліжэйшы час з'явіцца на сайце федэрацыі. «Мы будзем займаць цвёрдую крытычную пазіцыю пры прыняцці планаў і практычных дзеянняў, што супярэчаць законным інтарэсам работнікаў. Прафсаюзы, як гэта было і ў папярэднія гады, падтрымліваюць толькі эфектыўныя, сацыяльна арыентаваныя структурныя змены ў эканоміцы», — заявіў старшыня федэрацыі Міхаіл Орда на пленуме Савета ФПБ.**

### ТАРЫФНУЮ СТАЎКУ — ПАВЫСІЦЬ

Падчас мінулай пяцігодкі ў рамках Генеральнага пагаднення паміж урадам, рэспубліканскімі аб'яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў штогод забяспечваўся рост намінальнай і рэальнай заработнай платы. З 2010-га па 2014-ы сярэднямесячны рэальны заробак павялічыўся на 143 працэнты (з 347 да 619 долараў). Атрымалася падняць памер «мінімалкі» да мінімальнага спажывецкага бюджэту.

— Разам з тым заробак работнікаў дзяржаўных арганізацый складае толькі 75 працэнтаў (замест запланаваных 90) ад сярэдняй заработнай платы па рэспубліцы, — каментуе сітуацыю намеснік старшыні ФПБ Аляксандр МІКША. — Не змаглі дамагчыся значнага павышэння памеру тарыфнай стаўкі першага разраду. Нізкі аклад замінае істотна пабольшыць заробкі медыкам і настаўнікам. Перагляду патрабуе сённяшняя сістэма карэктуючых каэфіцыентаў, якія прывялі да дыспрапорцыі ў аплаце кваліфікаваных спецыялістаў і няволытных работнікаў. Гэта неабходна ўлічваць пры распрацоўцы праграмы на 2015-2020 гады.

**Прафсаюзы пастаянна шэфствуюць над дзіцячымі дамамі і школамі-інтэрнатамі. З 2010 па 2014 гады на такія ўстановы выдаткавалі амаль 12 мільярдаў рублёў.**

Каэфіцыент суадносінаў пенсіі і сярэдняга заробку склаў 43,5 працэнта, што перавышае ўзровень, устаноўлены Міжнароднай арганізацыяй працы. Удасканальвалася прафесійнае пенсійнае страхаванне персаналу, занятага на працах з асаблівымі ўмовамі. Гэтыя пытанні былі адлюстраваны ва Указе Прэзідэнта № 441 ад 25 верасня 2013 года. Работнікі, якія падлягаюць такому страхаванню, могуць выбраць спосаб кампенсацыі: скарыстацца правам на прафесійную пенсію (датэрміновую ці дадатковую) ці атрымліваць штомесячную даплату да заробку ў памеры, не меншым за суму ўзносаў. Самі тарыфныя ўзносы выраслі амаль у два разы.

Рэгулярна пераглядаліся памеры дапамогі на дзяцей. Цяпер на догляд першага дзіцяці штомесяц выплачваюць 35 працэнтаў ад сярэдняй заработнай платы па краіне, за другім і наступнымі — 40 працэнтаў. Адметна, што маці атрымліваюць дапамогу незалежна ад таго, працавала яна да нараджэння малога ці не.

Прафсаюзы пастаянна шэфствуюць над дзіцячымі дамамі і школамі-інтэрнатамі. З 2010 па 2014 гады на такія ўстановы выдаткавалі амаль 12 мільярдаў рублёў. Дапамагаюць таксама сем'ям рыхтаваць школьнікаў да навучальнага года (на гэтыя мэты з прафсаюзнага бюджэту штогод ідзе каля 10 мільярдаў). Яшчэ 46 мільярдаў падчас мінулай пяцігодкі пайшло на аздараўленне дзяцей у летніках (у тым ліку 41 мільярд — на зманшэнне кошту пуцёвак).

### ДАГАВОР ДЛЯ ЎСЯГО КАЛЕКТЫВУ

За 2010-2014 гады прафсаюзы выявілі 163 тысячы парушэнняў працоўнага заканадаўства. У 96 працэнтах выпадкаў правапарушэнні ліквідавалі. Па патрабаванні прафарганізацый работнікам вярнулі суму ў 77 мільярдаў рублёў.

На сёння ў рэспубліцы зарэгістравана больш за 16 тысяч калектыўных дагавораў. З улікам сучаснага стану на рынку працы асаблівую ўвагу ў лакальных дакументах прафсаюзы надаюць дадатковай сацыяльнай падтрымцы работнікаў, што знаходзяцца пад рызыкай звальнення.

Па прапанове федэрацыі ўнеслі змяненні ў Падатковы кодэкс, згодна з якім выходная дапамога, якая выплачваецца па калектыўным дагаворы, вызваляецца ад падаходнага падатку, калі не перавышае дзевяць працэнтаў ад сярэднямесячнага заробку супрацоўніка.

Міхаіл Орда адзначыў, што калектыўнымі дагаворамі карыстаюцца не толькі члены прафсаюза. На думку старшыні, каб такая сітуацыя не выклікала абурэння ў плацельшчыкаў узносаў, якія заключылі дамову, трэба скарэктаваць заканадаўства. Напрыклад, даваць магчымасць іншаму персаналу карыстацца правамі і гарантыямі дагавора толькі пры згодзе бакоў, што падпісалі гэты дакумент (вопыт Даніі). Ці дазволіць наймальніку кожны месяц пералічваць на рахунак прафарганізацый сродкі з заробку работнікаў — не членаў прафсаюза, на якіх распаўсюджваецца дзеянне дагавора, як гэта робіць у Турцыі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

### У ГАЛІНЕ

*Падводзячы вынікі працы на 8-м з'ездзе Беларускага прафсаюза работнікаў культуры за мінулую пяцігодку,* ***старшыня Цэнтральнага камітэта галіновага прафсаюза Наталля АЎДЗЕЕВА*** *адзначыла, што адмоўныя наступствы аптымізацыі, праведзенай у галіне, былі мінімізаваны. Скарацілі ў асноўным вакантныя пасады, асоб пенсійнага ўзросту, адміністрацыйна-кіраўнічы і абслугоўвы персанал. У арганізацыях Міністэрства культуры замест запланаваных 20 працэнтаў штатных адзінак скасавалі 9,5 працэнта. Прафсаюз звяртаўся ў Нацыянальны савет па працоўных і сацыяльных пытаннях з просьбай змяніць заканадаўства, каб захаваць аб'ём дзяржаўнага фінансавання ў памеры, што быў да аптымізацыі. Грошы, якія вызваляцца, можна было б накіраваць на павышэнне заробкаў бюджэтнікаў.*

*— Важна ўстанаўліваць надбаўкі асобным дзеячам, — кажа Наталля Пятроўна. — Так, летась Мінпрацы прыняло пастанову № 67, якая прадугледжвае істотнае павелічэнне тарыфных ставак за падрыхтоўку пераможцаў і ўдзельнікаў афіцыйных міжнародных спартыўных спаборніцтваў. Пашырылі дыяпазон месяцаў, занятых на гэтых спаборніцтвах, па восьмае ўключна, за якія ўстанаўліваецца надбаўка.*

*Дарэчы, само прафаб'яднанне плануецца перайменаваць у Беларускі прафсаюз работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму, паколькі ў шматгаліновую арганізацыю, акрамя прадстаўнікоў сферы мастацтва, сёння ўваходзяць супрацоўнікі тэлерадыёвяшчання, кнігавыдавецтва, паліграфіі, СМІ, фізічнай культуры.*

■ Задача на перспектыву

# БАЛОНСКІ ПРАЦЭС: НАБЫЦЬ НОВАЕ І НЕ СТРАЦІЦЬ НАЙЛЕПШАЕ,

## або Як памяняць на хаду ў аўтамабіля колы і не з'ехаць у кювет?

**На гэтым тыдні ў Ерэване на канферэнцыі міністраў адукацыі краін — удзельніц Балонскага працэсу будзе разглядацца заяўка Беларусі на яе далучэнне да агульнаеўрапейскай адукацыйнай прасторы. А напярэдадні гэтай падзеі ў Мінску на базе БДУ прайшоў двухдзённы міжнародны семінар, арганізатарам якога выступілі Еўрапейскі фонд адукацыі, Сусветны банк, Белдзяржуніверсітэт і Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы. У цэнтры ўвагі яго ўдзельнікаў аказаліся пытанні развіцця нацыянальнай вышэйшай школы ў кантэксце еўрапейскіх стандартаў: пашырэнне акадэмічнай мабільнасці выкладчыкаў і студэнтаў, новыя прынцыпы ў забеспячэнні якасці адукацыі, прывядзенне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў у адпаведнасць з патрэбамі рынку працы і нават развіццё ў насельніцтва прадпрымальніцкай ініцыятывы і роля ў гэтым працэсе ўніверсітэтаў.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### КОЛЬКАСЦЬ ЦІ ЯКАСЦЬ?

— Мы разумеем, што працэс інтэграцыі ў еўрапейскую адукацыйную прастору — вельмі складаны і, як вынікае са стасункаў з нашымі калегамі, у розных краінах, якія ўжо далучыліся да балонскай сістэмы, існуе шырокі спектр праблемных пытанняў, звязаных з рэалізацыяй палажэнняў Балонскай дэкларацыі, — падкрэсліў **першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ.**

***Кіраўнік глабальнай практыкі адукацыі Сусветнага банка Крысціян АЭДА:*** *«Мы высока ацэньваем узровень развіцця сістэмы вышэйшай адукацыі ў Беларусі і ўпэўнены, што рашэнне аб далучэнні вашай краіны да Балонскага працэсу значна пашырыць магчымасці для беларускай вышэйшай школы. Гэта будзе прынцыповы афіцыйны крок для яе інтэграцыі ў еўрапейскую сістэму».*

Асноўны выклік у сферы адукацыі, з якім сутыкнуліся ўсе краіны ў другой палове XX стагоддзя, — пераход да масавай вышэйшай адукацыі: за гэты адрэзак часу колькасць студэнтаў павялічылася ў свеце з 13 да 82 мільёнаў! З аднаго боку, гэта аб'ектыўны працэс, бо без вышэйшай адукацыі стабільнае развіццё ў сучасным грамадстве не ўяўляецца магчымым. Але з іншага боку, такая масавасць стварыла мноства праблем: з фінансаваннем вышэйшай школы, якасцю адукацыі, працаўладкаваннем выпускнікоў і многія іншыя.

**Далучэнне да Балонскага працэсу — пытанне павышэння прэстыжу і канкурэнтаздольнасці беларускай вышэйшай адукацыі на міжнародным узроўні.**

Рэктар Нацыянальнага ўніверсітэта палітычных даследаванняў і дзяржаўнага кіравання, былы міністр нацыянальнай адукацыі Румыніі Рымус Прыкап'е расказаў, што ў 1990 годзе ў яго краіне налічвалася 38 дзяржаўных вышэйшых навучальных устаноў і ніводнай прыватнай. Сёння ж у Румыніі функцыянуюць 57 дзяржаўных ВНУ і 81 прыватная ўстанова. У 1990 годзе вышэйшую адукацыю атрымлівалі ў Румыніі 168 тысяч студэнтаў, а ў 2008 годзе іх колькасць даходзіла ўжо амаль да 1 мільёна. Але з сувязі са зніжэннем нараджальнасці ў краіне на 40 працэнтаў колькасць моладзі зменшылася і, адпаведна зменшылася і колькасць студэнтаў: зараз у ВНУ ўсіх формаў уласнасці навучаюцца 500 тысяч студэнтаў. Сутыкнулася Румынія і з успёскам адкрыцця прыватных ВНУ — у 1993 годзе іх налічвалася ўжо 128! Натуральна, што якасць адукацыі на фоне камерцыйных інтарэсаў адышла на другі план. Таму давялося наводзіць парадак у гэтым пытанні, чаму паспрыяла стварэнне незалежнага акрэдытацыйнага органа.

### КАМЕРЦЫЯЛІЗАЦЫЯ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ

— Тэндэнцыі развіцця вышэйшай адукацыі ў нашай краіне адпавядаюць сусветным. Не маевасць пацягнула за сабой працэсы камерцыялізацыі і вострую канкурэнцыю за чалавечыя рэсурсы, — падкрэслівае **рэктар Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы прафесар Віктар ГАЙСЁНАК.** — Колькасць студэнтаў у Беларусі вырасла ў параўнанні з 60-мі гадамі ў 8 разоў! На 10 тысяч насельніцтва ў нас прыпадае зараз каля 400 студэнтаў, і па гэтым паказчыку мы займаем чацвёртае месца ў свеце ўслед за Паўднёвай Карэяй, ЗША і Расіяй. Але ёсць адзін нюанс: прыкладна палова студэнтаў атрымліваюць адукацыю завочна, а да якасці завочнага навучання ёсць шмат прэтэнзій.

**Толькі каля 34% студэнтаў ВНУ навучаюцца за кошт бюджэтных сродкаў. У дзяржаўных ВНУ плацяць за сваё навучанне 53% студэнтаў.** Такім чынам вышэйшая адукацыя ў нас у значнай ступені камерцыялізавана. Найбольшая колькасць студэнтаў вывучаюць камунікацыі, права, эканоміку, арганізацыю вытворчасці, а ў прыватных ВНУ гэты напрамак абсалютна дамінуе — да 95% студэнтаў атрымліваюць сацыяльна-эканамічную адукацыю.

На думку Віктара Гайсёнка, галоўная задача, якая стаіць сёння перад ВНУ, — гэта якасць і эфектыўнасць вышэйшай адукацыі.

— Калі казаць пра нашу якасць, то Беларусь у параўнанні са сваімі суседзямі выглядае даволі нядрэнна ў міжнародных рэйтынгах універсітэтаў. Але ёсць і іншыя звесткі: Сусветны банк праводзіў сацыялагічнае даследаванне па вывучэнні ўзроўню кампетэнтнасці работнікаў. І Беларусь у гэтым плане значна адстала ад сваіх суседзяў: каля 70% кіраўнікоў кампаній заявілі, што навыкі іх работнікаў з'яўляюцца істотным стрымліваючым фактарам для развіцця іх прадпрыемства, — падкрэсліў рэктар Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы.

Між іншым, прагнозная патрэба ў тых ці іншых спецыяльнасцях адстае ад рэальнага выпуску ВНУ ў два разы. Гэта значыць, што за 5 гадоў да выпуску патрэбных спецыялістаў дзяржорганы даюць прагноз, які аказваецца заніжаным удвая, што сведчыць аб праблемах у сувязях паміж рынкам працы і вышэйшай школай. Зараз усе краіны спрабуюць вырашаць аналагічныя праблемы праз нацыянальную сістэму кваліфікацый і нацыянальную рамку кваліфікацый, але мы ў гэтых працэсах істотна ад усіх адстаём.

### ГАЛАЎНЫ БОЛЬ ДЛЯ ВНУ

Дзяржаўныя выдаткі на ўсю сістэму адукацыі складаюць каля 40 трыльёнаў рублёў. А на вышэйшую адукацыю ідзе толькі 13% ад гэтай сумы.

— Для нармальнага фінансавання вышэйшых навучальных устаноў гэтых сродкаў яўна недастаткова, — упэўнены Віктар Гайсёнак, — але ў найбліжэйшы час сітуацыя наўрад ці зменіцца, таму трэба думаць, як больш эфектыўна выкарыстаць тое, што мы маем . Фактар, які выклікае моцную фінансавую нагрузку, — гэта платнае навучанне студэнтаў у дзяржаўных ВНУ.

У сістэму вышэйшай адукацыі з бюджэту выдаткоўваецца 5 трыльёнаў рублёў. Гэтыя грошы павінны накіроўвацца на навучанне 34% ад агульнай колькасці студэнтаў, якія навучаюцца за кошт дзяржаўных сродкаў, бо астатнія павінны самі за сябе плаціць. Але студэнты платнай формы навучання ўносяць толькі каля 30 працэнтаў ад сумы, што выдзяляецца на навучанне аднаго студэнта-«бюджэтніка». Усё гэта стварае дадатковую нагрузку на нашы ВНУ. І калі такі падыход захаваецца і надалей, то не толькі абнаўленне, але і захаванне асноўных фондаў нашых устаноў будзе праблематычным.

Сярод праблем, якія стаяць перад вышэйшай школай, Віктар Гайсёнак узгадаў таксама цяжкасці ў кіраванні, перагружаную структуру спецыяльнасцей, адсутнасць рэальнай свабоды вучэбна-метадычных аб'яднанняў і эканамічна затратную мадэль магістарскай падрыхтоўкі. На І ступені навучання ў беларускіх ВНУ рыхтуюць па 382 спецыяльнасцях, на ІІ ступені — па 331 спецыяльнасці, а ўсяго налічваецца больш як 1600 адукацыйных праграм. І гэта колькасць яўна завышана...

У некаторых групах па падрыхтоўцы магістраў навучаюцца ўсяго па аднаму-два чалавекі. У Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы лічаць, што трэба адмаўляцца ад дзялення магістратуры на два віды — практыка-арыентаваную і навукова-арыентаваную.

### НЕ ВЫПЛЮХНУЦЬ ДЗІЦЯ

— Як можна павысіць якасць адукацыі? Мы звязваем гэтае пытанне з фарміраваннем якаснага кантынгенту студэнтаў і пашырэннем ужывання мэтавай падрыхтоўкі, — патлумачыў Віктар Гайсёнак, — каб кадры рыхтаваліся ў адпаведнасці з патрэбамі працадаўцаў. Трэба распрацаваць крытэрыі для магістарскіх праграм. ВНУ павінны кааперавацца ў гэтым пытанні, бо далёка не ўсе з іх могуць самастойна годна падрыхтаваць магістраў. Трэба пашыраць адказнасць і паўнамоцтвы вучэбна-метадычных аб'яднанняў ВНУ і іх кіраўнікоў, прычым не толькі на паперы.

**«Студэнты платнай формы навучання ўносяць толькі каля 30 працэнтаў ад сумы, што выдзяляецца на навучанне аднаго студэнта-«бюджэтніка».**

— Далучэнне да Балонскага працэсу надзвычай важнае для беларускай вышэйшай школы — упэўнены Віктар Гайсёнак. — Гэта дасць нам магчымасць фарміраваць адэкватную сучаснаму этапу развіцця вышэйшую школу і ліквідаваць існуючы разрыў з нашымі суседзямі. Нарэшце, гэта пытанне павышэння прэстыжу і канкурэнтаздольнасці беларускай вышэйшай адукацыі на міжнародным узроўні. Калі інвестар прыглядаецца да той ці іншай краіны, ён найперш думае, якія спецыялісты і з якім узроўнем адукацыі будуць забяспечваць яго бізнес.

Наша сістэма адукацыі стаіць зараз на перакрыжаванні: якой будзе вышэйшая школа, скажам, праз 10 гадоў, дакладна невядома. Але мы павінны рухацца наперад, захоўваючы ўсё найлепшае, што ў нас ёсць, і адсякаючы ўсё лішняе. Фактычна мы павінны на хаду памяняць у аўтамабіля колы, але зрабіць гэта вельмі асцярожна і акуратна, каб ён не з'ехаў у кювет. ■

### ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»:

У 1999 годзе ў Балонні адбылася першая канферэнцыя трыццаці еўрапейскіх міністраў адукацыі. Прынятая імі дэкларацыя «Зона еўрапейскай вышэйшай адукацыі" вызначыла асноўныя мэты, якія вядуць да збліжэння і гарманізацыі нацыянальных адукацыйных сістэм вышэйшай адукацыі ў краінах Еўропы і павышэння канкурэнтаздольнасці еўрапейскай вышэйшай школы. Сёння Балонскі працэс аб'ядноўвае ўжо 47 краін.

■ Дыялог

## СТУДЭНТЫ ПРАПАНУЮЦЬ...

**Ідэю адправіць некалькіх членаў Грамадскага рэспубліканскага студэнцкага савета ў еўрапейскія краіны для вывучэння вопыту ўдзелу студэнтаў у жыцці сваіх універсітэтаў агучыў міністр адукацыі Міхаіл Жураўкоў. На яго думку, вельмі якасна працуюць студэнцкія саветы ў Скандынаўскіх краінах.**

Нагадаем, што ў склад рэспубліканскага студэнцкага савета пры міністры адукацыі ўваходзіць па адным прадстаўніку ад кожнай вышэйшай навучальнай установы краіны.

Сустракаючыся з прэзідыумам рэспубліканскага савета, міністр адукацыі паставіў перад студэнцкім актывам задачу — стварыць банк таленавітай моладзі для папаўнення кадравага рэзерву кіраўнікоў.

— Безумоўна, каб граматна кіраваць, недастаткова мець толькі прызванне. Патрабуюцца таксама заняткі і трэнінгі па мастацтве зносін з людзьмі. Але ў нашай краіне не павінна быць кадравага голаду, — дадаў Міхаіл Жураўкоў.

Члены прэзідыума Грамадскага рэспубліканскага студэнцкага савета, у сваю чаргу, прадставілі міністру адукацыі асноўныя напрамкі сваёй дзейнасці на найбліжэйшую перспектыву.

Ужо падрыхтаваны праект «70 добрых спраў для ветэранаў». Плануецца правесці турыстычны злёт для студэнтаў ВНУ. Выязны форум пройдзе на Браслаўскіх азёрах. На базе Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта будзе арганізаваны міжнародны маладзёжны лагер. Ёсць прапанова арганізаваць інтэрнэт-флэшмоб «Акрэслі праблему», дзе кожны студэнт зможа задаць сваё праблемнае пытанне. Увагі заслугоўвае і ідэя правядзення інтэрактыўнага ток-шоу па пытаннях дзейнасці студэнцкага самакіравання ва ўстановах вышэйшай адукацыі ў рамках аднаго з нацыянальных тэлеканалаў.

■ Памяць

## У СПІСАХ ЗНАЧАЦЦА...

**Першая электронная інфармацыйна-даведачная база (hist.bsu.by/2ww) пра беларускіх салдат і партызан, якія загінулі або прапалі без вестак падчас Другой сусветнай вайны, распрацавана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Мяркуецца, што гэты праект дасць магчымасць стварыць адзіную сістэму захоўвання звестак аб удзельніках тых трагічных падзей.**

Ініцыятарам і распрацоўшчыкам электроннай базы выступіў гістарычны факультэт БДУ. Крыніцай інфармацыі паслужылі кнігі серыі «Памяць. Гісторыка-дакументальныя хронікі беларускіх раёнаў». Сёння гісторыкамі БДУ апрацоўваюцца і ўносяцца даныя па Мінскай вобласці і Мінску. У электронную сістэму ўжо ўнесены звесткі пра больш чым 10 тысяч удзельнікаў Другой сусветнай вайны.

У найбліжэйшы час супрацоўнікі і студэнты гістарычнага факультэта пачнуць напаўняць сістэму звесткамі пра воінаў-землякоў з іншых абласцей Беларусі.

Навігацыя электроннага рэсурсу дазваляе шукаць суайчыннікаў па катэгорыях «Прозвішча», «Імя», «Імя па бацьку», «Вобласць», «Раён», «Горад / вёска нараджэння», «Месца смерці».

Электронная інфармацыйна-даведачная сістэма з'яўляецца адкрытай. У выпадку выяўлення недакладных даных пра гэта можна будзе паведаміць на электронны адрас (hist.bsu.by/kontakt), а таксама прадаставіць новыя звесткі, якія не ўвайшлі ў кнігу «Памяць». ■

**Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Мы і свет

# НА «ЭКСПА-2015» МЫ МЯЖУЕМ З... МАЛАЙЗІЯЙ

## У найбліжэйшыя паўгода можна з'ездзіць у Італію і пакаштаваць кухню 140 краін

**1 мая ў Мілане (Італьянская Рэспубліка) адкрылася сусветная выстава «ЭКСПА-2015», якая будзе працаваць да 31 кастрычніка пад дэвізам «Накарміць планету. Энергія для жыцця». Гэта самая вялікая міжнародная выстава, прысвечаная тэматыцы харчавання, дзе будуць раскрыты многія праблемы і прадэманстраваны традыцыі, творчасць і інавацыі ў харчовай сферы. Удзельнічае больш за 140 краін свету, 10 міжнародных арганізацый і 30 карпарацый, чакаецца каля 20 мільёнаў наведвальнікаў. Пра беларускі павільён карэспандэнту «Звязды» расказвае намеснік старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Вячаслаў БРЫЛЬ.**



***— Чаму наша краіна ўдзельнічае ў выставе?***

— Тэматыка не адпавядае знешнегандлёвым інтарэсам Беларусі. Асноўная мэта ўдзелу нашай краіны ў выставе — звярнуць увагу наведвальнікаў на вялікі вопыт Беларусі ў сферы вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі і якасных прадуктаў харчавання. На нашу краіну прыпадае 1,4% сусветнай вытворчасці малака і 5% сусветнага экспарту малочнай прадукцыі. Акрамя таго, Беларусь уваходзіць у тройку лідараў сярод краін свету па вытворчасці калійных угнаенняў, якія, як вядома, акрамя павелічэння ўраджайнасці, паляпшаюць якасныя характарыстыкі прадукцыі.

***— Як выглядае беларускі павільён?***

— Наша краіна прадстаўлена ўласным павільёнам у цэнтральнай частцы пляцоўкі «ЭКСПА-2015» побач з Літвой і Малайзіяй. Канцэпцыя павільёна «Кола жыцця», які выкананы ў выглядзе ўзгорка, разрэзанага колам вадзянога млына, перамагла ў спецыяльным конкурсе. Камісіі гэтая канцэпцыя здалася найбольш цікавай. Тым больш што арганізатары патрабуюць, каб большая частка плошчы павільёна і пляцоўкі была менавіта зялёнай зонай. На нашым узгорку па працягу ўсёй выставы будзе расці, квітнець і зелянець натуральны газон з сапраўднымі кветкамі. Па канцэптуальным напаўненні павільён складаецца з дзвюх частак. Рэстаран нацыянальнай кухні, сувенірная крама, зала правядзення дзелавых мерапрыемстваў, форумаў, сустрэч, перамоў, а таксама невялікая VIP-тэрыторыя, дзе размешчана фотагалерэя, якая перыядычна змяняецца, — усё гэта знаходзіцца ў адной палове павільёна. У другой палове мы прапануем наведвальнікам вандроўку па Беларусі, калі з дапамогай мультымедыйных прылад і тачскрынпанэляў яны на кароткі час апынуцца ў атмасферы гасціннасці і аўтэнтычнасці нашай краіны, змогуць пазнаёміцца з яе гісторыяй, культурным, эканамічным і прыродным патэнцыялам.

***— Як наша краіна будзе шукаць партнёраў?***

— Пошук партнёраў — гэта не галоўная задача. «ЭКСПА» — іміджавая выстава. Наша мэта — зрабіць Беларусь яшчэ больш пазнавальнай, цікавай. Як непрамы эфект, мы хочам зрабіць так, каб у людзей пасля наведвання нашага павільёна з'явілася жаданне прыехаць у Беларусь. Разам з тым сёння наш павільён — гэта куток Беларусі ў Еўропе. На працягу 6 месяцаў гэтая пляцоўка можа выкарыстоўвацца любым прадпрыемствам альбо арганізацыяй Беларусі, каб паказаць сябе.

***— Бачна, што наша культура прадстаўлена на выставе добра, а як справа з эканамічнымі магчымасцямі?***

— Культуры і сапраўды будзе шмат. Кожны месяц новая вобласць будзе прэзентаваць сваю культурную разнастайнасць. Аднак, акрамя культурнай, пастаянна абнаўляецца і дапаўняецца дзелавая праграма. Адбудуцца таксама дні рэгіёнаў, дзе прадставяць эканамічныя, турыстычныя магчымасці. Будуць таксама праходзіць дні эканомікі, дні навукі. Асноўнае мерапрыемства — дні рэспублікі, якія пройдуць 9 і 10 верасня.

***— Ці ёсць сэнс ехаць нашым людзям на выставу?***

— Я думаю, што ёсць. Тым больш што «Белавія» павялічвае колькасць рэйсаў у Мілан. Калі ёсць магчымасць і няма іншых планаў, то варта наведаць. Уваход на выставу платны і залежыць ад таго, колькі дзён вы хочаце яе наведваць. Такія мерапрыемствы праходзяць толькі раз на пяць гадоў. Гэта своеасаблівая алімпіяда сярод выстаў. Гэтая выстава не нагружана нейкімі спецыфічнымі тэматыкамі і прысвечана прадуктам харчавання, што дае магчымасць у адным месцы пакаштаваць кухню любой краіны свету. Бо асноўнае патрабаванне арганізатараў заключаецца ў тым, каб у павільёне абавязкова прысутнічаў рэстаран нацыянальнай кухні. Многія краіны вязуць свае аўтэнтычныя прадукты. Мы таксама пастараліся максімальна прадставіць нашых вытворцаў. Асабліва тых, хто ўжо мае сертыфікацыю на рэалізацыю ў Еўрасаюзе.

***— Гэта ўжо пэўны экспарт атрымліваецца...***

— Мы спадзяемся, што па выніках дзелавых сустрэч нашы вытворцы пашыраць кола партнёраў з Еўрасаюза, бо гэты кірунак трэба развіваць. Мяркуем, што эканамічны эфект ад гэтага ў будучыні атрымаем. Тым больш, арганізатары лічаць, што наш павільён адзін з найлепшых па прыцягальнасці і архітэктуры.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

### ДАРЭЧЫ

**Выставы «ЭКСПА» з'яўляюцца найбуйнейшымі міжнароднымі некамерцыйнымі мерапрыемствамі, якія праводзяцца з мэтай дэманстрацыі апошніх тэхнічных і тэхналагічных дасягненняў краін-удзельніц у рамках зададзенай тэматыкі. Першая сусветная выстава была праведзена ў 1851 годзе ў Гайд-парку ў Лондане па ініцыятыве прынца Альберта. Галоўнай славутасцю выставы быў хрустальны палац, пабудаваны Джозефам Пакстанам з жалеза і шкла.**

■ Тэхналогіі

# ПАПЕРА ЎЖО НЕ КАМІЛЬФО?

**На Беларускай універсальнай таварнай біржы запускаецца праект па ўвядзенні тэхналогій, якія дазваляюць перадаваць электронныя накладныя ў біржавых здзелках. EDI-сэрвісы (электронны абмен інфармацыяй паміж партнёрамі) у біржавым гандлі будуць дадатковай выгадай для кліентаў. Дзякуючы гэтым інавацыям з'явіцца магчымасць не толькі здзяйсняць біржавыя аперацыі, але і ажыццяўляць суправаджэнне пастаўкі тавараў па біржавых здзелках у электронным выглядзе.**

## МЕНШ ВАЛТУЗНІ З ДАКУМЕНТАМІ

Беларуская біржа адна з найбуйнейшых у Еўропе. Таргі тут праводзяцца ў рэжыме рэальнага часу праз інтэрнэт. Усяго ўдзельнічаюць каля 14 600 прадпрыемстваў з 56 краін свету. На біржы здзяйсняецца больш за 250 тысяч здзелак у год.

«Уявіце сабе, які велізарны аб'ём дакументаў на папяровым носьбіце спатрэбіцца для афармлення гэтых здзелак. Таму мы і перавялі ўвесь наш дакументаабарот у электронную форму», — адзначыў **намеснік старшыні праўлення — галоўны інжынер Беларускай універсальнай таварнай біржы Сяргей ПАПУДРЭНКА.**

Электронныя накладныя — адмысловыя EDI-дакументы, у якіх перадаецца камерцыйная інфармацыя па пастаўках тавару і разліку падатку на дабаўленую вартасць. У перспектыве гэтыя дакументы павінны прыйсці на змену традыцыйным папяровым накладным. Так таварна-транспартныя і таварныя накладныя ў выглядзе электронных дакументаў будуць лічыцца створанымі, калі яны падпісаны электронным лічбавым подпісам. Падпісваючы дакумент у электронным выглядзе, суб'екты гаспадарання атрымліваюць дакумент, які мае аднолькавую юрыдычную сілу з тым, што на папяровым носьбіце.

EDI-тэхналогіі дазволяць аўтаматызаваць дзелавыя працэсы і падтрымку функцыянальнасці вытворчасці біржы, а таксама забяспечаць захоўванне ўсіх неабходных звестак. На біржы ўпэўнены, што чым хутчэй удзельнікі здзелак будуць абменьвацца электроннымі дакументамі, тым хутчэй будзе адбывацца пастаўка тавару. Таксама стваральнікі сцвярджаюць, што электронныя таварныя і таварна-транспартныя накладныя будуць больш бяспечныя. Строгія меры робяць несанкцыянаваны доступ да інфармацыі папросту немагчымым.

## ЛІЧБАВАЕ ЛЕПШАЕ?

Каб зразумець карыснасць праекта, неабходна паглядзець на выгаду для карыстальнікаў, якую разлічваюць атрымаць ад укаранення сэрвісу электроннага дакументаабароту. Папяровыя накладныя патрабуюць ручнога ўводу і тут ёсць магчымасць зрабіць памылкі ў таварных звестках, з імі павольней працаваць, яны прыводзяць да дадатковых выдаткаў (на паперу), якія ўзрастаюць з ростам колькасці бізнес-партнёраў. Электронны дакументаабарот паскарае прыём тавару, скарачае транспартныя выдаткі, звязаныя з рухам тавару ў ланцужках паставак, дазваляе атрымліваць і адпраўляць дакументы наўпрост са сваёй інфармацыйнай сістэмы, перакладае ўсе функцыі абслугоўвання на EDI-правайдара, здымае з бізнес-партнёраў неабходнасць турбавацца аб дастаўцы папер. У выпадку паспяховасці праекта далейшым крокам яго развіцця можа стаць нарошчванне тыпаў і колькасці інфармацыі, якая перадаецца электроннай дакументацыяй. Таксама магчымы будуць экспартна-імпартныя аперацыі з выкарыстаннем лагістычных цэнтраў і біржавых складоў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■

■ Спажывец

# ЯК СЭКАНОМІЦЬ «НА ЁГУРЦЕ»?

**Каля 60% пакупнікоў, для якіх цана з'яўляецца ключавым крытэрыем выбару, пры куплі прадукту ў імпартнай упакоўцы не ўдакладнялі розніцу ў кошце на аналагічныя беларускія тавары.**

Беларусь актыўна праводзіць палітыку імпартазамяшчэння. Гэта значыць, каб максімальна засцерагчы эканоміку краіны ад знешніх хваляванняў, вытворцы ўсё часцей укараняюць айчынныя аналагі звыклых тавараў. За апошнія пяць гадоў на рынак выйшла каля 350 навінак з пазнакай «Зроблена ў Беларусі». Аднак беларускі прадукт чамусьці кладуць у імпартную ўпакоўку. Дык якое гэта імпартазамяшчэнне? На гэтую тэму зрабіла даследаванне **студэнтка факультэта маркетынгу і лагістыкі БДЭУ Крысціна РАМАНОВІЧ.**

***— Ці падабаецца спажыўцам беларускі тавар?***

— На аснове звестак маркетынгавых даследаванняў было выяўлена, што больш за палову спажыўцоў аддаюць перавагу менавіта беларускаму тавару. Абумоўлены гэты выбар не толькі нізкім коштам прадукцыі айчынных вытворцаў, але і выдатнай якасцю. Дадзеная дынаміка назіралася пры аналізе малочнай прадукцыі ў трох буйных гіпермаркетах горада Мінска. У якасці ўзораў для даследавання былі абраны ёгурты пяці беларускіх малочных заводаў. Пры аналізе я выявіла, што на выбар спажыўцоў уплываюць наступныя крытэрыі: цана (35%), прыхільнасць да гандлёвай маркі (23%), знешні выгляд (22%), смакавыя дабаўкі (15%), тэрміны вырабу (5%).

***— Як доўга пакупнік звычайна выбірае прадукт?***

— Спажыўцы затрачваюць не больш за 10 секунд на выбар неабходнага ёгурту. У асноўным час затрачваецца на пошук патрэбнага прадукту і праверку тэрмінаў прыдатнасці. Каля 60% пакупнікоў, якія сцвярджалі, што цана з'яўляецца ключавым крытэрыем адбору, пры ажыццяўленні пакупкі аддавалі перавагу ёгурту ў імпартнай упакоўцы, не ўдакладняючы розніцу ў кошце на аналагічны прадукт. Але хацелася б адзначыць, што беларускі ёгурт у імпартнай шкляніцы не смачнейшы і не больш якасны за той, што мае айчынную ўпакоўку.

***— І якая ж розніца ў цане?***

— Чысты кошт самога прадукту аднолькавы, але пасля фасоўкі яго ў імпартную упакоўку ён становіцца да 20% вышэйшым. Хочам мы гэтага ці не, але цана на тавар узрастае праз набыццё ўпакоўкі за мяжой. Абумоўлена гэта тым, што рост коштаў на канчатковы прадукт наўпрост залежыць ад павелічэння выдаткаў на вытворчасць і дастаўку, а таксама з прычыны немагчымасці разліку ў нацыянальнай валюце з пастаўшчыкамі. Пры гэтым якасць тавару застаецца нязменнай. Незразумела, чаму ж сёння на прылаўках гіпермаркетаў сем з васьмі прадстаўленых беларускіх ёгуртаў маюць імпартную ўпакоўку. Дадзеная статыстыка не вытлумачальная, бо ў завозе шкляначак з Германіі, Фінляндыі, Індыі, Літвы няма патрэбы, паколькі на тэрыторыі Беларусі існуе мноства невялікіх фірмаў па вырабе ўпакоўкі і буйны барысаўскі завод «Палімiз», вядомы сваёй якаснай упакоўкай на замежных рынках.

***— На ваш погляд, гэта нельга лічыць імпартазамяшчэннем?***

— Прадукцыя беларускіх вытворцаў можа быць беларускай толькі пры ўмове імпартазамяшчэння на ўсіх стадыях працэсу вытворчасці. Робячы выбар на карысць беларускага тавару, пераканайцеся ў тым, што вас не змушаюць плаціць за імпартную ўпакоўку. Падтрымліваючы палітыку дзяржавы, вы ўмацуеце эканамічны эфект ад яе ўкаранення. Паверце, што толькі спажывец можа сфарміраваць попыт на беларускі тавар, гэтым прымусіўшы вытворцаў да поўнага імпартазамяшчэння. Да таго ж, калі раней некаторая ўпакоўка была ў спісе тавараў, якую немэтазгодна было выпрацоўваць, то сёння на многіх беларускіх заводах праведзена мадэрнізацыя абсталявання і запушчана вытворчасць сучаснай упакоўкі.



Фота Надзеі БУЖАН.

***— Можа быць, імпартнае «адзенне» больш падабаецца нашым пакупнікам у эстэтычным плане?***

— Пры выбары тавару не варта забывацца, што ў першую чаргу спажывец купляе яго, а ўпакоўка — гэта ўсяго толькі магчымасць забяспечыць абарону прадукцыі ад пашкоджанняў і страт, навакольнага асяроддзя і забруджванняў. Заўсёды застаецца адно пытанне: навошта мы плацім больш? Мы часта запыняемся ля прылаўку, чытаючы на ўпакоўцы састаў прадукту. Усё гэта, вядома, правільна і добра, але, чытаючы пра ўласцівасці тавару, неабходна больш старанна вывучыць і саму ўпакоўку, яе знешні выгляд, матэрыял вырабу, краіну вытворчасці. Гэта дазволіць спажыўцу, як мінімум, на 10-20% скараціць штомесячныя выдаткі на набыццё харчовых тавараў. Да таго ж, прытрымліваючыся палітыкі «Купляйце беларускае», вы дапаможаце айчынным вытворцам адваяваць уласны рынак, а потым заваяваць знешні.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

■ Прафесіяналы

# ДА ПАКУПНІКОЎ — ЯК ДА СЯБРОЎ

**Калегі па рабоце ў «Белсаюздруку» Святлана ГНАЦІЎ і Вольга АЛЯКСЕЕВА жывуць на захадзе і ўсходзе нашай краіны — у Гродне і Магілёве. Працоўныя абавязкі ў іх, вядома, са сваёй спецыфікай. Але ёсць і агульнае — жаданне бачыць у пакупніках не проста, так бы мовіць, крыніцу гандлёвых даходаў, а найперш сяброў.**



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Гродна: Надзея СУПІЕВА з дзецьмі Арынай і Дзмітрыем — сярод пастаянных пакупнікоў Святланы ГНАЦІЎ.



Фота Нэлі ЗІГУЛІ.

Магілёў: Вольга АЛЯКСЕЕВА заўсёды знойдзе, чым заахвоціць пакупніка.

Павільён «Гроднааблсаюздруку», дзе працуе прадаўцом Святлана Гнаціў, знаходзіцца ў гістарычным цэнтры горада над Нёманам. Умовы для кліентаў, сярод якіх нямала турыстаў, тут на самым сучасным узроўні. Гэта тычыцца і вялізнага асартыменту друкаванай, іншай прадукцыі, і размяшчэння тавару, і, зразумела, такога важнага фактару ў рабоце любога гандлёвага пункта, як прафесіяналізм прадаўца. А ён звязаны не толькі з чыста прафесійнымі ведамі, падыходам да справы, але і з паважлівымі, тактоўнымі адносінамі да пакупнікоў. Для Святланы Леанідаўны гэта норма, а адсюль і пастаянныя кліенты.

Магілёўскі магазін «Раніца» маленькі, але ўтульны і па-сапраўднаму дамашні. «Таму, напэўна, нашы кліенты могуць затрымлівацца тут адразу на некалькі гадзін, — смяецца яго загадчыца Вольга Аляксеева. — Прыходзяць, мэтанакіравана ідуць да канкрэтнай палічкі, бяруць кнігу (мы нават ужо ведаем якую) і чытаюць. Мы не перашкаджаем. Ведаем, літаратура сёння не танная, а кніжную навінку не заўсёды знойдзеш у бібліятэцы». А яшчэ кнігарню на рагу вуліцы Першамайскай і праспекта Міра вельмі любяць дзеці (тут заўсёды можна купіць нешта цікавае на зніжках) і аматары свежых навін (газеты і часопісы тут раскладзены наўпрост на шырокім падаконніку). Нельга прайсці міма.

**Барыс ПРАКОПЧЫК,**
**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■ Май на ўвазе!

## Новы лагістычны маршрут у Польшчу

**Беларуская чыгунка прапануе пасажырам новы лагістычны маршрут з Мінска ў Польшчу праз Гродна.**

У выніку дамоўленасці з Польскай чыгункай з 11 мая змяняецца расклад руху цягніка №193 Гродна — Малкінія, які будзе адпраўляцца з Гродна ў Польшчу ў 12.50 (замест 11.23). У прэс-службе магістралі распавялі, што гэта зробіць магчымым перасадку пасажыраў цягніка міжрэгіянальных ліній №673 Мінск — Гродна на цягнік №193. Далей цягнік №193 Гродна — Малкінія будзе прыбываць у Беласток у 14.57, у Малкінію — у 16.23.

Мэтай рэалізацыі гэтага праекта з'яўляецца павышэнне прыцягальнасці пасажырскіх перавозак як у межах Беларусі, так і ў міжнародных зносінах, а таксама развіццё турыстычных маршрутаў, узмацненне транспартных сувязяў нашай краіны з краінамі Еўразаюза.

Ранішні цягнік міжрэгіянальных ліній №673 Мінск — Гродна курсіруе па Беларускай чыгунцы з 29 сакавіка. Са станцыі Мінск-Пасажырскі ён адпраўляецца ў 6.56 і прыбывае ў Гродна ў 11.26. Час у дарозе са сталіцы ў Гродна складае 4 гадзіны 30 хвілін. Цягнік робіць тры прыпынкі — у Маладзечне, Лідзе і Мастах.

## Расклад транспарту — па запатрабаванні

**Дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» прапануе паслугу па атрыманні інфармацыі аб часе да прыбыцця грамадскага транспарту на прыпыначны пункт з дапамогай USSD-запыту для абанентаў сотавай сувязі.**

Для атрымання інфармацыі неабходна зрабіць USSD-запыт: пры дапамозе мабільнага тэлефона набраць камбінацыю сімвалаў *960*шыфр#, дзе шыфр — гэта пяцізначны нумар прыпыначнага пункта, па якім пасажыру неабходна атрымаць інфармацыю. Гэты шыфр размяшчаецца на таблічцы з раскладам руху транспарту побач з найменнем прыпыначнага пункта. Цягам некалькіх секунд на мабільны тэлефон прыйдзе паведамленне, дзе будзе ўтрымлівацца інфармацыя аб часе адказу на запыт, нумары маршруту і часе (у хвілінах) да прыбыцця транспартнага сродку патрэбнага маршруту на прыпыначны пункт (для ўсіх маршрутаў). Гэтая паслуга — платная. Як удакладнілі ў «Мінсктрансе», кошт залежыць ад тарыфных планаў мабільных аператараў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**


Idea Bank
Отличная идея!

# ОФИЦИАЛЬНЫЕ ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Отличная идея – выиграть!»

1. Настоящая рекламная игра называется «Отличная идея – выиграть!» (далее по тексту – «Игра»), проводится в соответствии с условиями настоящих правил (далее по тексту – «Правила») с соблюдением требований законодательства Республики Беларусь без взимания с участников Игры дополнительной платы.

Игра имеет целью стимулирование продаж в Республике Беларусь кредитных продуктов Закрытого акционерного общества «Идея Банк», за исключением кредита «Твои мечты».

2. Организатором Игры является Закрытое акционерное общество «Идея Банк», зарегистрированное Национальным банком Республики Беларусь решением от 24 апреля 2004 года №58 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 807000122. Юридический адрес: Республика Беларусь, 220034, г. Минск, ул. З. Бядули, д. 11, электронный адрес info@ideabank.by (далее – Организатор).

3. Для контроля за ходом Игры создается Комиссия по ее проведению. Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения Игры в следующем составе:

Председатель:

Хватик Николай Николаевич, начальник управления обслуживания частных клиентов ЗАО «Идея Банк»;

Члены Комиссии:

Дубовец Николай Николаевич, начальник управления партнерского сотрудничества ЗАО «Идея Банк»;

Олейник Александр Михайлович, начальник управления маркетинга ЗАО «Идея Банк».

Новиков Андрей Сергеевич, директор ООО «Техномода»;

Садовская Ксения Александровна, главный экономист управления партнерского сотрудничества ЗАО «Идея Банк».

4. Участником Игры может стать физическое лицо, являющееся гражданином Республики Беларусь либо имеющее вид на жительство в Республике Беларусь, выразившее желание принять участие в Игре путем заключения кредитного договора на условиях, установленных настоящими Правилами, и выполнившее условия участия в Игре.

Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

5. Игра проводится на территории Республики Беларусь.

Срок начала Игры – 12 мая 2015 года.

Срок окончания Игры, включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения Игры, – 29 июня 2015 года.

Розыгрыш призов проводится 17 июня 2015 года в соответствии с пунктом 9 настоящих правил Игры.

6. Для того чтобы принять участие в Игре необходимо:

- в период с 12 мая 2015 года по 13 июня 2015 года заключить с Банком кредитный договор на условиях одного из кредитных продуктов, за исключением кредита «Твои мечты», и получить кредит согласно условиям заключенного договора.

- на 16.06.2015 заключенный кредитный договор должен быть действующим и не погашен досрочно;

- на 16.06.2015 должен отсутствовать факт просрочки исполнения кредитополучателем обязательств перед Банком по всем заключенным договорам.

7. Призовой фонд Игры.

В рамках Игры в качестве призов разыгрываются денежные средства на сумму остатка основного долга, но не более размера задолженности на момент выдачи приза, направляемые в счет погашения кредита.

Призовой фонд сформирован в следующем размере:

| № | Наименование | Единица измерения | Кол-во | Сумма на 1 ед. | Всего |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Денежные средства на сумму остатка основного долга, но не более размера задолженности на момент выдачи приза, направляемые в счет погашения кредита. | суммы | 5 | 70 000 000 | 350 000 000 |

Призовой фонд Игры в размере 350 000 000 (триста пятьдесят миллионов) белорусских рублей сформирован за счет денежных средств Организатора.

8. Права участников Игры.

Участник Игры имеет право: знакомиться с Правилами Игры, принимать участие в Игре на условиях, определенных Правилами.

9. Розыгрыш Призов, определение Победителей Игры.

Розыгрыш призов осуществляется по адресу: 220034, РБ, Минск, ул. З. Бядули, 11 17 июня 2015 года в 15.00.

В розыгрыше призов принимают участие все участники Игры, при этом участники Игры, выполнившие условия настоящих Правил более одного раза, принимают участие в розыгрыше один раз.

Определение победителей осуществляется с помощью лототрона. Для проведения каждого розыгрыша призов используется набор шаров в количестве 10-ти штук с номерами от 0 по 9.

За ходом каждого розыгрыша призов следит комиссия по проведению Игры. Итоги каждого розыгрыша призов Игры фиксируются в Протоколе Комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии.

Определение выигрышных номеров получателей Призов происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из барабана.

Для определения цифры первого слева разряда выигрышного порядкового номера член комиссии помещает в барабан шары с номерами, соответствующими первым слева цифрам номера кредитного договора, участвующего в розыгрыше. Член комиссии извлекает из барабана один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера.

После этого в барабан загружаются все десять шаров, шары перемешиваются, и из барабана извлекается шар, номер которого определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Номер шара вносится в протокол, производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах порядковых номеров в базе номеров кредитных договоров и при наличии совпадения выпавший номер шара записывается в соответствующий разряд выигрышного номера. В противном случае извлеченный шар не возвращается в барабан, и член комиссии извлекает следующий шар. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон соответствующих разрядов порядковых номеров в базе номеров кредитных договоров.

Таким образом определяются пять победителей рекламной игры.

Организатор не позднее 22.06.2015 извещает Победителей о выигрыше заказными письмами с уведомлением по адресам, указанным в заключенных с Банком договорах.

10. Вручение Призов Победителям Игры.

Победитель может получить приз в офисе организатора по адресу: г. Минск, З.Бядули, 11 в период с 18.06.2015 по 29.06.2015 включительно.

При получении приза Победитель должен иметь при себе документ, удостоверяющий личность (действительный паспорт гражданина Республики Беларусь, вид на жительство).

Для зачисления выигранной суммы Победитель должен предъявить документ, удостоверяющий личность, и подписать заявление на перевод денежных средств на счет по учету кредитной задолженности.

Проценты, начисленные к моменту внесения суммы основного долга, Победитель должен внести за счет собственных средств.

11. Победитель несет ответственность за уплату подоходного налога в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Факт участия в Игре подразумевает, что ее Участники соглашаются с тем, что в рамках Игры их имена, отчества, фамилии, фотографии, интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в рекламных материалах. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Все права на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

Организатор не несет ответственности за работу почтовых служб, телефонной связи и Интернета.

Участники Игры, претендующие на получение Приза, обязуются заполнить и подписать все документы, предоставляемые Организатором Игры, необходимые для получения Призов.

Участие в Игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

В случае письменного отказа Победителя от получения Приза либо неполучения его в установленные Правилами сроки, либо нарушения Победителем настоящих Правил, приз остается у Организатора и используется по его усмотрению.

12. Информация об Игре, публикация Правил Игры.

Правила Игры будут опубликованы в газете «Звязда» до начала Рекламной Игры.

Результаты Рекламной Игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» не позднее 27 июня 2015 года.

Дополнительно информацию об Игре можно получить по телефону: + 375 (17) 306-33-14 либо короткому номеру 7555 с мобильных с 08.00 до 20.00 или на сайте www.ideabank.by.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 2546 от 6 мая 2015 г. выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

■ Не прапусціце

# Перамога на канверце

**Днямі ў беларускай сталіцы адкрылася VIII Нацыянальная філатэлістычная выстава «Белфіла-2015». Да 15 мая яе можна наведаць у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі.**



Леў Коласаў праводзіць экскурсію па выставе для ветэранаў.

Сёлета асноўная тэма выставы — Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне. Многія калекцыі марак, паштовых картачак, мастацкіх маркіраваных канвертаў прысвечаны менавіта ёй. Спецыяльна да свята Перамогі філатэлістамі была падрыхтавана разнастайная прадукцыя: паштовы блок, марка, два канверты Першага дня, 8 канвертаў серыі «Героі Савецкага Саюза», канверт «70 гадоў Перамогі. 9 Мая. Дзякуй за Перамогу!». Дарэчы, у музейнай краме можна набыць паштоўкі і іншую філатэлістычную прадукцыю, прысвечаную Вялікай Перамозе.

За сваю калекцыю на ваенную тэматыку галоўную ўзнагароду конкурсу філатэлістычнай выставы атрымаў **намеснік старшыні Беларускага саюза філатэлістаў Леў КОЛАСАЎ.** Ён з'яўляецца прызнаным спецыялістам у гэтай сферы, таму распавёў карэспандэнту «Звязды», з чаго пачыналася гэтае захапленне ў нашай краіне:

— Беларуская філатэлія з'явілася ў 1924 годзе. Тады ў Мінску арганізавалася суполка філатэлістаў. Аднак яна доўга не праіснавала — у 1930-я гады была закрыта НКУС. Аднавілася толькі пасля вайны, у 1957—1958 гадах у Мінску арганізавалі клуб калекцыянераў, з яго ўсё і пачалося. Тады нас было вельмі шмат, каля 3000 калекцыянераў, ды яшчэ юнакі. Зараз аматараў такой справы нашмат менш, аднак людзі, што любяць калекцыянаваць, ёсць па-ранейшаму. Цікавая калекцыя, таксама адзначаная ўзнагародай, прадстаўлена старшынёй Беларускага саюза філатэлістаў Сяргеем Піліповічам. Яму ўдалося сабраць унікальныя рэчы канца Першай сусветнай вайны — пачатку рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. Тады пошта працавала па-рознаму, часам добра, а часам з перабоямі — трагізм і пераменлівасць можна прасачыць праз яго калекцыю.

Яшчэ адзін унікальны збор ужо нашага часу — гэта калекцыя паштовых марак і картачак на біблейскія сюжэты. Яе аўтар — Лявон Карповіч з вёскі Лунна Мастоўскага раёна. Ён, дарэчы, сам зрабіў і апісанне кожнага экспаната на беларускай мове. Яго калекцыя атрымала залаты медаль выставы.

Акрамя айчынных экспанентаў, на «Белфіла-2015» можна ўбачыць і калекцыі з іншых краін — Азербайджана, Германіі, Казахстана, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ. Фота аўтара**



Падчас урачыстага ўзнагароджвання «Белфіла-2015».

■ Абрысы Радзімы

# «ГЭТАЯ ДАЎНІНА ЦЯГНЕ МЯНЕ, ЯК МАГНІТ»

## Як Анатоль Федарук «адкрывае» для нас старажытныя сядзібы

**У Новым замку Гродна адбылася прэзентацыя кнігі прафесара Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, доктара біялагічных навук Анатоля Федарука «Старажытныя сядзібы Гродзеншчыны». Аўтар разглядае мастацкія стылі ў сядзібным дойлідстве і садова-паркавым мастацтве, прадстаўляе гісторыю сядзіб і іх уладальнікаў, характарыстыкі жылых, гаспадарчых і культавых будынкаў, паркаў і водных сістэм, сядзібную культуру, расказвае пра асаблівасці вядзення гаспадаркі і сучасны стан гэтых аб'ектаў.**



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Гістарычныя славутасці быццам вяртаюцца да нас з небыцця — дзякуючы шматгадовай, самаадданай працы Анатоля Федарука. Прычым гэта не проста канстатацыя таго, што страчана і засталося, а найперш зварот да нашых сучаснікаў. Каб яны ведалі, шанавалі сваю спадчыну і зрабілі ўсё магчымае дзеля яе захавання і адраджэння.

**— Анатоль Тарасавіч, старажытныя сядзібы Беларусі вы вывучаеце ўжо больш за 40 гадоў, прычым, так бы мовіць, на грамадскіх пачатках. Як гэта ўдаецца і што дае сілы на такую велізарную працу?**

— Я дзясяткі разоў чуў: «Навошта ён ходзіць па гэтых руінах? Што там можна ўжо знайсці?» І, мабыць, кінуў бы, калі б не кніжка выдатнага пецярбургскага акадэміка Дзмітрыя Ліхачова. Ён пісаў: «Нават паветра на месцы сядзіб асаблівае. Гэта паветра гісторыі». І я зразумеў, што ўсё трэба ўлічваць, класці на паперу — для нас і нашых нашчадкаў, каб ганарыліся сваёй спадчынай. Сядзібныя мясціны, іх асаблівы дух цягнуць мяне, быццам магнітам.

**— Серыя «Старажытныя сядзібы Беларусі» пасля Міншчыны і Брэстчыны прадоўжылася Гродзеншчынай ...**

— У 2013 годзе выдадзена кніга пра сядзібы Карэліцкага раёна. А гэтая прысвечана сямі раёнам Гродзенскай вобласці — Бераставіцкаму, Ваўкавыскаму, Воранаўскаму, Гродзенскаму, Дзятлаўскаму, Зэльвенскаму і Іўеўскаму. Спачатку ў маім «дасье» было каля 100 сядзіб, а за апошнее дзесяцігоддзе спіс павялічыўся да 600 аб'ектаў, што прыкладна ўдвая больш, чым на Брэстчыне. Гродзеншчына — найлепшы рэгіён Беларусі і па ступені захаванасці сядзіб, якія эвалюцыяніравалі ў духу вялікіх мастацкіх стыляў: ад абарончых умацаванняў да рэнесансных палацаў, ансамбляў часоў барока і класіцызму, а потым да эпохі эклектыкі — апошняй у развіцці сядзібнага дойлідства.

**— У сённяшнім разуменні сядзіба — гэта дом, нейкія гаспадарчыя пабудовы ды агарод. Аднак калі пачытаць вашу кнігу...**

— Гісторыя сядзібнага дойлідства на беларускіх землях налічвае больш за 5 стагоддзяў. І я хачу, каб нашы сучаснікі і нашчадкі разумелі, што ўяўляла з сябе ў мінулым сядзіба. Гэта не проста аб'ект матэрыяльнай каштоўнасці — сядзібны дом, іншыя службовыя і гаспадарчыя будынкі, што часткова захаваліся да нашых дзён. Гэта феномен, які задумваўся як «ідэальны свет» з асаблівым духоўным зместам. Прастора, дзе абмяркоўваліся і вырашаліся, мажліва, самыя высокія, мудрыя жыццёвыя пытанні — сэнс быцця, чалавечыя каштоўнасці. У традыцыях роду складваўся асаблівы не толькі матэрыяльны, але і духоўны свет. Сядзіба выхоўвала чалавека, патрабавала быць годным свайго ўзроўню. «Мілы Геранім, — звяртаўся Ян Караль Хадкевіч да сына, — не марнуй часу, вучыся, бо дурным быць шляхціцу не прыстойна».

У сядзібах нараджалася адметная культура садова-паркавага мастацтва, земляробства, жывёлагадоўлі. Многія шляхцічы любілі зямлю, клапаціліся пра яе стан і ўрадлівасць. Правільныя севазвароты, элітнае насенняводства, пародзістая жывёла, пладовыя сады, паркі, зарыбленыя ставы, пчальнікі... Сядзібы Гродзеншчыны адпавядалі сусветным тэндэнцыям развіцця сельскай гаспадаркі. Напрыклад, у 1601 годзе ў Смаргонскім фальварку брэсцкага ваяводы Хрыстафора Зяновіча меліся галандскія каровы і свінні, італьянскія авечкі і куры з чорнымі барадамі, індыкі, паўліны, свой конны завод.

**— Асобная тэма кнігі — сядзібныя калекцыі і сямейныя рэліквіі...**

— Мастацкія, этнаграфічныя, нумізматычныя і іншыя зборы былі абавязковымі для многіх сядзіб. Калекцыяніраванне з'яўлялася паказчыкам добрага густу і адукаванасці. А асабліва каштоўнымі былі ў сядзібах архівы і бібліятэкі. «Калісьці Беларусь была краінай бібліятэк», — так пісаў вядомы беларускі гісторык Яўген Калубовіч. На 25 квадратных вёрстах мелася па адной вялікай бібліятэцы, акрамя дробных кнігазбораў. Пра адносіны да кніг можна меркаваць, напрыклад, па завяшчанні 1582 года. Ежы Зяновіч. Ён прасіў «мілага сына Мікалая» і яго нашчадкаў берагчы бібліятэку як асаблівую каштоўнасць — не дзяліць яе, а прымнажаць, не раздаваць, не пазычаць кнігі.

А ў чым сэнс партрэтаў гаспадароў сядзіб? Гэта было не проста самалюбаванне — сувязь пакаленняў. Партрэты размяшчаліся ў сядзібах як напамін, што кожны наступны ўладальнік павінен быць не горшым за папярэдняга. Вось як даражылі традыцыямі!

Уліччы каштоўнасцей, якія страціла наша зямля, ужо немагчыма. Многае загінула ў полымі войнаў, што не згарэла — разышлося па свеце, асела ў музейных калекцыях і бібліятэках розных краін. У кнізе мы пастараліся адзначыць асноўныя бібліятэчныя зборы найбольш буйных сядзіб.

**— У кнізе «Старажытныя сядзібы Гродзеншчыны» — і гордасць за справы нашых продкаў, і боль за страчанае, і надзея на будучыню ...**

— Так. Мы далёка не заўсёды па-сапраўднаму цэнім і змагаемся за захаванне нашых каштоўнасцей. У кнізе нямала адпаведных фактаў. Зносяцца старадаўнія гаспадарчыя пабудовы, якія чамусьці не лічацца гістарычнымі помнікамі. Адбываецца нейкае павальнае знішчэнне старых дрэў, што пры пэўным падыходзе можна захаваць. Напрыклад, знаходжанне ўязной алеі ў сядзібу Аўгустовак, што бувала пра праекце Джузэпэ дэ Сака, мне падказалі клёны, што захаваліся, і тры конскія каштаны, якія яшчэ за полькім часам былі прафесійна амалоджаны. Чаму б не праявіць прафесіяналізм і цяпер? Не, у 2011 годзе гэтыя каштаны спілавалі.

А на месцы іншай сядзібнай алеі сёння можна ўбачыць толькі шыны, якія пакладзены на пні.

Мы страцілі культуру садоўніцтва — любім часцей букеты, а не самі расліны.

Але ёсць і цудоўныя ўзоры павагі да нашай гістарычнай спадчыны. Напрыклад, яшчэ за савецкім часам у вёсцы Свіслач Гродзенскага раёна быў адноўлены і да сённяшняга часу знаходзіцца ў выдатным стане былы палац графіні Марты Красінскай. У гэтым заслуга Васіля Густыра — кіраўніка мясцовага сельгаспрадпрыемства, аднаго з найлепшых у нашай краіне. Дзе сапраўдны гаспадар — там адразу бачны вынік, у тым ліку і што тычыцца мясцовых славутасцей.

Гордасцю гродзенскай зямлі я лічу і сядзібу «Каралінскі фальварак Тызенгаўза», якая на высокім узроўні, з густам, любоўю да нашай спадчыны адраджаецца дзякуючы Паўлу Клімуку.

Дарэчы, яшчэ 5-7 гадоў таму я не мог паверыць, што нехта стане купляць і адраджаць старажытныя сядзібы. Але такія прыклады, у тым ліку і на Гродзеншчыне, ужо ёсць. Гэта і мне дае настрой на далейшыя даследаванні.

**— Вельмі сімвалічна, што ў якасці мецэната, прафінансаваўшы выданне кнігі «Старажытныя сядзібы Гродзеншчыны», выступіў наш славуты гістарычны аб'ект — замкавы комплекс «Мір»...**

— Так, я вельмі ўдзячны за гэта яго дырэктару Вользе Папко. Хочацца, каб кніга разышлася і затраты акупіліся. Тады можна будзе думаць і пра выданне другога тома «Старажытных сядзіб Гродзеншчыны» — пра іншыя раёны. Матэрыялы ў асноўным ужо падрыхтаваны.

«Яшчэ 5-7 гадоў таму я не мог паверыць, што нехта стане купляць і адраджаць старажытныя сядзібы. Але такія прыклады, у тым ліку на Гродзеншчыне, ужо ёсць. Гэта і мне дае настрой на далейшыя даследаванні».

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■ Калекцыя

# Фотаальбом часоў Першай сусветнай

**Прадметы салдацкага побыту, фрагменты амуніцыі, медыцынскія прылады, шмат фотаздымкаў — выстава «Беларусь у Першай сусветнай вайне» часова прапісалася ў Магілёўскім музеі этнаграфіі. Летась яна стартавала ў Смаргоні, і яе ўжо паспелі пагладзець жыхары Мінска, Гомеля, іншых гарадоў. Тут прадстаўлены экспанаты адразу некалькіх музеяў Беларусі — Нацыянальнага гістарычнага, Магілёўскага, Лідскага, Гродзенскага, Слонімскага, Кобрынскага.**

Шмат цікавых прадметаў прадстаўлена з прыватных калекцый. Напрыклад, тыя ж медыцынскія прылады. «Усе яны імпартныя, падчас вайны іх вельмі не хапала, таму ўсё, што захавалася, само па сабе эксклюзіў», — сведчыць **намеснік дырэктара Нацыянальнага гістарычнага музея Аляксандр ХРАМОЙ**, які прыняў удзел у адкрыцці выставы. З прыватных калекцый у музейныя вітрыны трапілі таксама грашовыя знакі, аўтамабільная і кухонная каністры, процігазавая сумка... Не менш цікавымі знаходкамі на час выставы падзяліўся 52-гі спецбатальён Мінабароны. Тыя ж пагоны ваеннага лётчыка — па словах спецыялістаў, вельмі рэдкі экспанат — былі знойдзены пошукавікамі падчас стварэння мемарыяла ў гонар воінаў Першай сусветнай на Старажоўскіх могілках у Мінску. Адчуць на сабе подых часу дазваляюць фотаздымкі, якія можна патрымаць у руках і нават пагартаць альбом. Тое, што гэта толькі копіі, адразу і не разумееш. А яшчэ эфект прысутнасці стварающь хранікальныя кадры.

— Каб было відаць, як «ваявалі» рэчы з выставы, мы зрабілі фільм на 27 хвілін і 2 хранікальныя сюжэты, адзін з якіх расказвае пра вайну ў разрэзе ўсяго сусвету, а другі — толькі Беларусі, — тлумачыць Аляксандр Храмой. — А фотавыстава, якая часткова прадстаўлена ў Магілёве, другі год ездзіць па Еўропе і ўжо наведала 12 дзяржаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

на право заключения договора аренды земельного участка для строительства и обслуживания станции технического обслуживания в районе дер. Волма, Драчковского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком, зал заседаний, 18 июня 2015 г. в 11.00 |
| 3 | Продавец и его адрес | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот № 1 — площадь 0,8672 га, кадастровый номер 624800000001002526 в районе дер. Волма, Драчковского сельсовета |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Лот № 1 — для строительства и обслуживания станции технического обслуживания |
| 7 | Срок аренды | Лот № 1 — 99 (девяносто девять) лет |
| 8 | Сроки заключения договора аренды | После оплаты стоимости предмета аукциона в течение 2 рабочих дней |
| 9 | Начальная (стартовая) цена продажи | Лот № 1 — 887 400 000 рублей |
| 10 | Условия аукциона | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть индивидуальные предприниматели, юридические лица;<br>В) без права предоставления рассрочки |
| 11 | Наличие инженерной инфраструктуры | Лот № 1 — электроснабжение, водоснабжение |
| 12 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| 13 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка. Расчетный счет 3641000000205 ЦБУ 621 филиала 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, УНП 600014139, ОКПУ 04064735, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок») |

**Затраты на организацию и проведение аукциона в том числе (изготовление землеустроительного дела, осуществление государственной регистрации создания земельных участков, публикация информационного сообщения) подлежат возмещению победителями аукциона.**

**Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками — каждый четверг с 9.00 до 13.00.**

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Подлесная, д. 11, каб. № 8.**

**Окончательный срок приема заявлений — 12 июня 2015 г. 17.00.**

**Контактные телефоны (8-01776) 5-43-55, 5-53-42, моб. 8 033 902-71-20.**

Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

- заявление на участие в аукционе;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- индивидуальным предпринимателям — копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем индивидуального предпринимателя — нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь — доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителям иностранного гражданина — легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели и юридические лица, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

**Неявка участника аукциона на аукцион признается отказом в его участии.**

## ОАО «НАФТАН» РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ

(с повышением начальной цены)

**БЫВШЕЕ В УПОТРЕБЛЕНИИ НЕИСПОЛЬЗУЕМОЕ ИМУЩЕСТВО:**

УНП 300042199

| Пометка на конверте | Наименование | Инв. № | Год выпуска | Начальная цена с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|---|
| Реализация неликвидов, 11.06.2015 | Шкода Октавия 1,8Т 4х4, гос. № 08-49 АЕ-2 (с дополнительным комплектом шин и дисков) | 13150701 | 2004 | 50 250 000 |
| | МАЗ 104С(Автобус), гос. № ВЕ 16-02 | 13150554 | 2000 | 114 000 000 |
| | МАЗ 103062(Автобус), гос. № АА 5927-2 | 13150784 | 2006 | 204 000 000 |
| | МАЗ 251050(Автобус), гос. № АВ 7040-2 | 13150858 | 2009 | 1 000 000 000 |
| | ПАЗ 320530(Автобус), гос. № ВА 73-28 | 13150689 | 2004 | 44 500 000 |
| | ПАЗ 320530(Автобус), гос. № АА 2093-2 | 13150726 | 2005 | 44 500 000 |
| | Автомобиль ГАЗ 2217, гос. №4479 АН-2 | 13150729 | 2005 | 25 500 000 |
| | Трактор Беларусь МТЗ 1220, гос. № 2400 БЯ | 04152045 | 1995 | 57 000 000 |
| | Трактор Беларусь МТЗ 80, гос. № 8158 БХ | 04152050 | 1992 | 46 000 000 |
| | ВАЗ 2123000 (Шевроле Нива GLS), гос. №7575 АН-2 | 13150748 | 2006 | 58 800 000 |
| Реализация неликвидов. Мебель. | Кровать односпальная | 16000261 | 1995 | 1 632 000 |
| | Кровать односпальная | 16000272 | 1995 | |
| | Кровать односпальная | 16000283 | 1995 | |
| | Кровать односпальная | 16000292 | 1995 | |
| | Кровать односпальная | 16315818 | 1995 | |
| | Кровать односпальная | 16315975 | 1995 | |
| | Стол черный | 16000582 | 1995 | |
| | Стол черный | 16000614 | 1995 | |
| | Тумба прикроватная | 16000695 | 1995 | |
| | Стол низкий | 16315916 | 1995 | |
| | Стол низкий | 16315931 | 1995 | |

Состояние удовлетворительное.

**Предложения принимаются по адресу: 211440, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30 по местному времени 11 июня 2015 года**

с пометками на конверте, указанными в таблице.

Извещения на проведение конкурса размещены на сайте **www.naftan.by.**

**Контактные телефоны: 8(0214) 59-87-83, 8(0214) 59-89-26, 8(0214) 59-88-42, 8(0214) 59-88-01, (033) 398 08 48, (033) 398 07 67.**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества | **Лот № 1. Легковой джип УАЗ 3163 020, рег. номер 6547 АР-2, стоимостью 48 700 000 рублей.** |
| Собственник (владелец) имущества | ОАО «Новая Гвардия» |
| Местонахождение (адрес) имущества | д. Козяны Браславского района |
| Информация об обременениях | автомобиль не снят с регистрационного учета |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | Витебская обл., г. Браслав, ул. Красноармейская, д. 8, каб. 15<br>01 июня 2015 года в 10.00 |
| Справочная информация | Отдел принудительного исполнения Браславского района<br>211970, Витебская обл., г. Браслав, ул. Красноармейская, д. 8<br>Начальник отдела – Чернявский Иван Никодимович, тел. 80215362585. |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет отдела принудительного исполнения Браславского района № 3642903000074 в РКЦ №205 в г. Браслав филиала №214 в г. Новополоцк ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801660, УНП 300002505, не позднее 16.00 29.05.2015.<br>Минимальная величина первого шага – 5% стоимости лота.<br>В соответствии со ст.486 ГПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование и краткая характеристика объекта, адрес расположения | Капитальное строение, инв. № 400/С-46318 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), площадью 273,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Озерское шоссе, 12. Составные части и принадлежности: три кирпичные пристройки – склад, асфальтобетонное покрытие, ограждение бетонное, ограждение деревянное, ворота металлические. |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 440100000002000592, площадью 0,0632 га (назначение – строительство и обслуживание здания) по адресу: г. Гродно, ул. Озерское шоссе, 12 |
| Начальная цена продажи | 825 000 000 (восемьсот двадцать пять миллионов) белорусских рублей с учетом НДС |
| Сумма задатка | 41 250 000 (сорок один миллион двести пятьдесят тысяч) белорусских рублей |
| **ЛОТ 2** | |
| Наименование и краткая характеристика объекта, адрес расположения | Капитальное строение, инв. № 401/С-16330 (назначение – здание неустановленного магазина, наименование – цех торгового оборудования), площадью 1379,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Интернациональная, 58. |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 422050400002002300, площадью 0,2800 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания цеха торгового оборудования) по адресу: г. Скидель, ул. Интернациональная, 58. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2, площадью 0,2800 га. |
| Начальная цена продажи | 1 115 000 000 (один миллиард сто пятнадцать миллионов) белорусских рублей с учетом НДС |
| Сумма задатка | 55 750 000 (пятьдесят пять миллионов семьсот пятьдесят тысяч) белорусских рубля |
| **ЛОТ 3** | |
| Наименование и краткая характеристика объекта, адрес расположения | Капитальное строение, инв. № 400/С-48538 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), площадью 598,5 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Озерское шоссе, 20. Составные части и принадлежности: подвал, пристройка, рампа. |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 440100000002006545, площадью 0,0515 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания книготорга) по адресу: г. Гродно, ул. Озерское шоссе, 20 |
| Начальная цена продажи | 1 655 922 000 (один миллиард шестьсот пятьдесят пять миллионов девятьсот двадцать две тысячи) белорусских рублей с учетом НДС |
| Сумма задатка | 82 796 100 (восемьдесят два миллиона семьсот девяноста шесть тысяч сто) белорусский рублей |
| Продавец | Гродненский городской филиал облпотребобщества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32 |
| Условия аукциона | Аукцион без условий |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с 3015214950031 в ОУ ОАО «БелАгроПромБанк», код 457, УНН 590959404.<br>Получатель – Гродненский городской филиал облпотребобщества |

**Аукцион состоится 26 мая 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
- *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь*: заверенная копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица и заверенные копии учредительных документов;
- *индивидуальным предпринимателем*: документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
- физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
- представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, до продажи объекта в процессе аукционных торгов, без объяснения причины.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 18.03.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**

**Последний день приема заявлений 21 мая 2015 г. до 15.00.**

**Телефон для справок: 41-98-32– Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Дополнительная информация: www.ino.by**

## Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2**

- ✓ Оценка оборудования и транспортных средств
- ✓ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- ✓ Независимая строительная экспертиза

## Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества Светлогорское районное потребительское общество (РАЙПО), 8(02342)3-40-74

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. (с НДС) | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Рынок «Центральный» в составе:<br>- капитальное строение – магазин «Надежда» и бар «Светлана» с инв. №342/С-136807, площадью 329,3 кв. м, (составные части и принадлежности: котельная);<br>- капитальное строение – торговый павильон с инв. №342/С-136806, площадью 610,4 кв.м;<br>- капитальное строение – туалет с инв. №342/С-137586, площадью 32,7 кв.м;<br>- асфальтобетонное покрытие площадью 10600 кв.м, забор металлическая сетка на металлических столбах площадью 909,0 кв.м.<br>Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 325050100001000466 площадью 1,7278 га, по адресу: Гомельская область, г. Светлогорск, ул. Светлая, 10. | 4 800 000 000 | 480 000 000 |

| | |
|---|---|
| Срок подачи заявления | **По 05 июня 2015 г. в рабочие дни с 9.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2** |
| Дата, время, место проведения аукциона | **09 июня 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2** |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012105618108 в РД №700 ОАО«БПС- Сбербанк», код 369, УНП 102353509<br>Получатель платежа: Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» |
| Условие пользования | Объекты продаются в собственность. Цель использования объекта не ограничивается |
| Условия продажи | Цены указаны с НДС. Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор купли-продажи в течение 10-ти календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость объекта согласно договора купли-продажи.<br>Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. |

**Дополнительная информация по тел. (0232) 75 06 62, тел./факс (0232) 75 06 63, сайт www.bti.by**

# ЯК ПАДАРОЖНІЧАЮЦЬ... ЗУБАСТЫЯ КІТЫ?

## Упершыню ў Беларусь з Крыма прывезлі на гастролі бялух



**Карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў перасоўным цырку на вадзе, калі ён працаваў у Віцебску, і пацікавіліся, як падарожнічаюць бялухі вагой больш за 400 кілаграмаў. Здзівіліся таму, што трэба каля 15 тон солі, каб зрабіць для іх «марскую ваду». Зразумела, не абышлося без пытанняў пра асаблівасці дрэсіроўкі гэтых прадстаўнікоў віду зубастых кітоў. Паколькі ў бялухі няма спіннога плаўніка, яе яшчэ называюць «бяскрылы дэльфін».**

### ПРАФЕСІЯ, ЯКОЙ АФІЦЫЙНА НЯМА

Шацёр, у якім выступаюць бялухі, манціруецца ўсяго за 2-3 дні. У глядзельнай зале больш за 300 месцаў. Калі мы напрасіліся за кулісы дэльфінарыя на колах, павінна была пачацца рэпетыцыя. Дзве бялухі: дзяўчынка Полі і хлопчык Эльф, калі мы зайшлі ў шацёр, забаўляліся ў вялікім басейне. Убачыўшы дрэсіроўшчыка, яны хуценька падплылі да яго. Падчас трэніроўкі паказвалі розныя трукі. Сярод іншага выскаквалі з вады, каб дакрануцца пысачкамі да вялікіх шароў, гулялі з мячамі, паказвалі, як карысна чысціць зубы... А цалаваліся як цудоўна!



Трэнер і бялухі падчас рэпетыцыі.

— Я з Крыма, а дакладней — з Севастопаля. І мае партнёры (бялухі) адтуль. Іх не ў гадавальніку вырасцілі, злавілі ў акіяне. Я — не дрэсіроўшчык, а трэнер марскіх млекакормячых. Дарэчы, афіцыйна такой прафесіі няма. І трэніраваць бялух нідзе не вучаць. Я — самавучка, — распавядае **Сяргей Калягенка.**

Гэты вельмі прыветлівы 28-гадовы мужчына сказаў, што трапіў у дэльфінарый выпадкова прыкладна 10 гадоў таму.

— Спачатку грузчыкам працаваў, потым — вартаўніком. Глядзеў, як працуюць трэнеры, потым узялі ў памочнікі. Вы былі ў звычайным цырку? Заўважылі, што там, напрыклад, львоў і «пакараць» за непаслухмянасць на арэне могуць, калі лянуюцца? Мы з бялухамі — партнёры, — працягвае суразмоўца.

Насамрэч, рэпетыцыя і выступленні больш нагадваюць гульню. Вядома ж, у якасці «выйгрышу» водныя гіганты атрымліваюць рыбу.

### «ЖЫЛЛЁ» — 400 ТОН ВАДЫ

Сяргей з любоўю распавядаў пра сваіх «вучняў». У прыватнасці, даўжыня старэйшай па ўзросце 5-гадовай Полі прыкладна 3,7 метра, вага — каля 450 кілаграмаў.

— Кормяць Полі і Эльфа выключна марскою рыбай. Ядуць мойву, траску, селядзец (іх любімая «страва») і іншае. У дзень з'ядаюць прыкладна па 25 кілаграмаў. Замарожаны корм для іх купляем у звычайных крамах. Бялухі выступаюць і жывуць у гэтым басейне. Яго дыяметр — 12 метраў. Па акружнасці — жалезныя шчыты, каб вытрымалі напор вады. У «арэне» пад 400 тон вады, якую бяром са звычайнага водаправода. Так, робім штучную марскую ваду. Для гэтага за раз выкарыстоўваем каля 15 тон звычайнай кухоннай солі. Вада фільтруецца і чысціцца бесперапынна, апрасняецца, асвяжаецца, — дзеліцца нюансамі Сяргей.

Перад пераездам у чарговы горад бялух кладуць на спецыяльныя насілкі, каб апошнія вытрымалі вагу, каб бялухі не параніліся, падымаюць кранам, маніпулятарам. І потым — у басейн на колах. Перавозяць бялух падчас гастроляў у звонку тыповай фуры. Але ўнутры — басейн глыбінёй 4 метры. За рулём незвычайнага аўто штатны вадзіцель, які мае вопыт перавозкі млекакормячых. Вядома, з такім грузам не разгонішся. Хуткасць — максімум 70 кіламетраў у гадзіну, каб вада не вылівалася, каб не атрымалі хвастатыя пасажыры траўмы...

Як спяць бялухі? Трэнер распавёў, што проста «завісаюць» у вадзе. Пры гэтым, зразумела, з заплюшчанымі вачыма рэагуюць на любы шоргат. Каб выспацца, ім досыць 2,5-3 гадзіны.

### ЯНЫ МОГУЦЬ І... ЛЯЧЫЦЬ

Калі гутарылі, Полі, плаваючы ля борта, «праяўляла ініцыятыву». Падумаў, што раўнуе да трэнера, а высветлілася, што фліртуе са мной. Пару разоў пускала ў мой бок струменьчыкі вады, сваволіла. Ледзь адскочыў ад яе чарговага «кампліменту». З трэнерам і фатографам мы смяяліся ад душы.

— Дарэчы, наконт «жаночага характару». Самкі вучацца вельмі хутка, практычна адразу схопліваюць, але ў працы пачынаюць трошкі халтурыць. А самцы, як правіла, вучацца горш, але працуюць без сюрпрызаў. Так, і ў бялух можа быць дрэнны настрой. Я гэта адчуваю. Падымаюся на масток і адразу бачу, хто будзе сёння горш працаваць, а хто добра. Яны ж і «размаўляюць»... Як разумеюць мяне? Рэагуюць на жэсты. Ім не прынцыпова, хто з імі працуе. Але па-рознаму, можна так сказаць, наладжваецца кантакт. Напрыклад, адзін трэнер знаходзіць агульную мову за паўгода. Я з імі толькі месяц працую, — інтрыгуе крымчанін.

Бялухі, як і дэльфіны, выкарыстоўваюцца ў так званай дэльфінатэрапіі. Яны спакайнейшыя за дэльфінаў. З імі камфортней тым, хто не вельмі добра плавае. Сеансы рэкамендуюцца для карэкцыі псіхічнага развіцця людзей з захворваннямі нервовай сістэмы, для лячэння раннага дзіцячага аўтызму, дзіцячага цэрабральнага паралічу і іншых захворванняў.

Зразумела, у цыркавых бялух іншыя задачы. Але іх выступленне ўжо сам па сабе — псіхатэрапеўтычны сеанс. А яшчэ яны і... прафесійныя мастакі. У Віцебску карціны, намаляваныя бялухамі падчас паказу, прадавалі на аўкцыёне. (Аўтар з твораў купілі за 400 тысяч рублёў.)

Таксама бялухі выкарыстоўваюцца ў якасці памочнікаў для вадалазаў, служаць у арміі, дапамагаюць здымаць пад вадой фільмы...

Пасля Віцебска бялух, паўночных марскіх львоў, марскіх коцікаў можна будзе ўбачыць і ў іншых гарадах краіны... Усё лета артысты плануюць радаваць сваім шоу жыхароў Беларусі. Вядома ж, у Мінску можна ўбачыць дэльфінаў. Але бялухі — гэта кіты, якія «самі» могуць прыехаць у глыбінку.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**



Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

**А вы ведалі, што...**

- **Цяжарнасць бялухі — да 14 месяцаў, немаўля яна корміць грудным малаком.**
- **Пры нараджэнні бялухі цёмнага колеру, «аж чорныя». Калі вырастаюць, становяцца беласнежнымі, бо жывуць у паўночных шыротах.**
- **Як паведаміў трэнер, вядомы толькі адзін выпадак, калі бялуха нарадзіла ў няволі (у Кітаі).**
- **У дзікай прыродзе бялуха можа быць вагой 3 тоны і 6 метраў у даўжыню.**
- **Бялуха можа плыць з хуткасцю 22 кіламетры ў гадзіну.**
- **Бялухі жывуць на волі ў сярэднім 40 гадоў, а ў дэльфінарыях могуць і 70.**
- **На Алтаі самая высокая гара Бялуха вышынёй 4440 метраў; ёсць і самалёт кампаніі Airbus, у назве якога ёсць слова «бялуха».**

# Шчасце — побач

**Што агульнага ў мінчан і, напрыклад, жыхароў Барселоны? Думаю — дабрыня. Але праяўляецца яна трохі па-рознаму. Нядаўна я вярнулася ў Мінск пасля тыдня, праведзенага ў Барселоне, і зараз паспрабую расказаць пра гэта.**

Усе адзначаюць дабрыню і гасціннасць беларусаў. І гэта насамрэч так. Памятаеце, як у 2011-м пасля тэракта мінскія таксісты бясплатна развозілі пасажыраў метро? А потым мы ўсе разам збіралі грошы, каб дапамагчы ахвярам? Упэўнена, кожны з нас можа ўспомніць не адзін выпадак, калі яму або яго знаёмым ці сябрам дапамагалі абсалютна незнаёмыя людзі. Так, мы, беларусы, заўсёды прыйдзем на дапамогу, калі нешта здарыцца. Але праяўляць свае пачуцці на людзях, нават самыя добрыя, мы часта саромеемся.

Памятаю адзін не вельмі шчаслівы для мяне, хоць і дробязны насамрэч, выпадак, калі я, спяшаючыся да аўтобуса, зачапілася за нешта і ўпала, разбіўшы калена да крыві і парваўшы сумку, якой спрабавала затармазіць. Паднялася... Побач, на прыпынку, стаялі людзі і старанна рабілі выгляд, што нічога не заўважылі. А мне хацелася праваліцца скрозь зямлю... Добра, што вадзіцель (добры чалавек!), відаць, убачыўшы маю бяду: пачакаў, пакуль я, кульгаючы, дабрыла да аўтобуса, і толькі тады зачыніў дзверы.

Нядаўна ў Барселоне я не заўважыла шкляныя дзверы нейкага магазінчыка і з усёго размаху ўехала ў іх ілбом. Малады хлопец, што стаяў непадалёк, тут жа кінуўся да мяне і, лапочучы нешта на сваёй мове, пачаў... гладзіць мяне па галаве. Маўляў, усё будзе добра, да вяселля зажыве — менавіта так я ўспрыняла гэты яго непасрэдны жэст. І сапраўды, дробязь, было б чаго хвалявацца...

Іншым разам я думаю: цікава, ці змог бы хтосьці з беларусаў адрэагаваць такім жа чынам у дачыненні да незнаёмага чалавека? Вельмі сумняваюся. Мы, беларусы, чамусьці больш суровыя ў праяўленні сваіх пачуццяў і не надта схільныя паказваць сваю прыязнасць ці спачуванне, асабліва калі на нас глядзяць іншыя.

Я была ў Барселоне якраз тады, калі там праходзіў «Marato Barcelona» — штогадовы марафон, на які ў горад з'язджаюцца бегуны з усяго свету. Ехала ў метро і спачатку не магла зразумець, адкуль столькі людзей (гэта была раніца нядзелі, а народу, як у мінскім метро ў час пік). Але ўразіла мяне ўсё ж не гэта. У нейкі момант цягнік рэзка тармазнуў і людзі літаральна пасыпаліся адзін на аднаго. Ведаеце, якая рэакцыя была ў пасажыраў? Усе пачалі смяяцца, жартаваць, і людзі, што стаялі і трымаліся за поручні, сталі з усмешкамі працягваць руку дапамогі тым, каму не было за што трымацца: маўляў, трымайся за мяне... У мінскай падземцы я такога пакуль што не бачыла.

Я здымала пакой у апартаментах (у параўнанні з гатэлямі гэта больш танны варыянт размяшчэння). Раніцай, на хуткую руку нешта перахапіўшы, выходзіла з дома і збочвала ў маленькую кавярню, што была насупраць, каб выпіць гарачай кавы. «Добрай раніцы!» — радасна вітала мяне афіцыянтка па-іспанску. «Добрай раніцы!» — радасна адказвала я па-англійску. Мы цудоўна разумелі адна адну. Яна рабіла мне каву, смяялася, нешта напявала, падсоўвала мне свежы часопіс пагартаць і жэстамі паказвала, які цудоўны дзень настаў, надвор'е і ўсё астатняе — проста клас! Дарэчы, так было практычна ў кожнай кавярні, у якую я завітвала. І ўсмешкі, як ні дзіўна, былі сапраўднымі.

Толькі не трэба казаць, што іспанцы бесклапотныя і бестурботныя. У Іспаніі самы высокі на Захадзе ўзровень беспрацоўя, і іншых праблем таксама хапае.

Ведаеце, на якой думцы я сябе міжволі лаўлю? А можа, яны так паводзяць сябе таму, што, як ні парадаксальна гэта прагучыць, крыху большыя эгаісты, чым мы? Толькі іх эгаізм больш разумны і, магчыма, трымаецца на вельмі цвярозай думцы: калі хочаш, каб у цябе быў добры настрой і, наогул, адчуваць сябе камфортна, зрабі так, каб было камфортна тваім суседу.

Менавіта гэтым жаданнем пачуваць сябе добра тлумачацца, на маю думку, і ветлівасць, і прыязнасць, і жаданне саступаць. Ты паказваеш: праходзьце (бо, здаецца, падышла крыху пазней). А табе ў адказ: праходзьце, калі ласка, вы. І гэтая ветлівая пантаміма працягваецца да той пары, пакуль, нарэшце, першым не пойдзе той, у каго раней здадуць нервы (жарт, калі хто не зразумеў).

А калі сур'ёзна, то паводзіны іспанцаў вельмі добра ўкладваюцца ў тэорыю разумнага эгаізму Чарнышэўскага, які лічыў неабходнымі аб'яднанне і ўзаемадапамогу, узаемападтрымку людзей, таму што мы не можам быць шчаслівымі «самі з сабой», а толькі ў зносінах з іншымі людзьмі. Прычым наша шчасце цалкам залежыць ад шчасця вельмі многіх. Нездарма ж гавораць: «Пакрыўджаны крыўдзіць іншых, шчаслівы — адорвае шчасцем».

А што ж мы, беларусы, няўжо не разумеем гэтага? Разумеем, безумоўна. Але, як мне падаецца, у нас уступаюць у гульню крыху іншыя фактары. Колькі разоў нам было «не да жыру»! Таму ў нас культура выжывання, а не культура жыцця. Але на дварэ дваццаць першае стагоддзе. Ужо 70 гадоў мірнае неба над галавой. Можа, час вучыцца быць шчаслівымі?

**Святлана БУСЬКО**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Тэхналогіі

# РОБАТЫ ВЫХОДЗЯЦЬ У СВЕТ

**Наша цывілізацыя рухаецца наперад у сваім імкненні зрабіць жыццё чалавека лепшым, зручнейшым, у рэшце рэшт, лягчэйшым і больш камфортным для індывідуума. Калісьці даўно людзі толькі марылі, што ўсю працу за іх будуць рабіць робаты, а зараз старанна ажыццяўляюць. Механічныя прылады, абсалютна розныя па канструкцыі і прызначэнні, ужо даўно працуюць, і сферы іх выкарыстання ўсё шырыцца. А яны ўсё больш становяцца падобнымі да людзей. Чалавеку, здаецца, мала зносінаў з іншымі людзьмі. А можа, ён хоча стварыць кагосьці лепшага за сябе? Філасофскае пытанне для доўгіх абмеркаванняў. Але гэта ўсё пасля, а пакуль людзі канструююць і збіраюць сабе механічных слуг, памочнікаў, часам нават сяброў. Пазнаёмімся з некаторымі.**

## НАПЕРАД, ДА БІЯБОТАЎ

Калі большасць людзей думаюць пра нанабота, яны ўяўляюць маленькіх, цалкам механічных істот. Аднак за апошнія гады навукоўцы дамагліся значных поспехаў у зусім іншай сферы нанамашын, якія бяруць пачатак з некалькі іншых навукова-фантастычных традыцый: гэта кібаргі. Навукоўцы Універсітэта Ілінойса нядаўна апублікавалі артыкул, у якім апісалі свае поспехі па адаптацыі бактэрыяльных спор з нанатэхналагічнай мэтай. Споры bacillus subtilis, звычайных бактэрый, што часта сустракаюцца ў жвачных жывёл і людзей, пакрылі малюсенькімі плямкамі графіту (графенавымі квантавымі кропкамі), каб стварыць электраправодную паверхню. Выкарыстоўваючы натуральнае імкненне бактэрый набракаць да вялікіх памераў, паглынаючы ваду ва ўмовах высокай вільготнасці, або памяншацца ў сухіх умовах, навукоўцы змаглі выкарыстаць споры як электроды-правадніка-на-чыпе, якія могуць выяўляць умовы павышанай вільготнасці, счытваючы ўзроўні супраціўлення.



Стварэнне новага тыпу дэтэктара вільготнасці можа не здавацца асабліва рэвалюцыйнай падзеяй, аднак гэта доказ канцэпцыі таго, што ў сферы нанаробатаў можна ісці іншым шляхам. Гэтую тэхніку выкарыстоўваюць тысячагоддзі прыроднага прагрэсу, у працэсе якога з'явіліся паўаўтаномныя нанатэхналагічныя прылады. Нягледзячы на дасягненні з канца 1980-х гадоў у галіне скануючай тунэльнай мікраскапіі (якія дазваляюць навукоўцам праглядаць структуры на атамным узроўні) і мікраасэмбліі, на дадзены момант адной з самых вялікіх перашкод на шляху да нанаробатаў застаецца тое, што няма менавіта такіх машын, якія здольны вырабляць малюсенькія машыны. Надзейныя, кіраваныя і якія змогуць паўтараць маніпуляцыі кампаніяметамі на малекулярным узроўні па-ранейшаму застаюцца недасягальнымі для навукоўцаў. Біялагічныя ж аб'екты гэтыя пытанні вырашылі ў далёкай старажытнасці. Хімічныя працэсы, якія кіруюць жыццём, адтачылі здольнасць ствараць мільярды ідэальных копій.

Гэтая тэхніка прадэманстравала, што ў дадзеным выпадку навукоўцы змаглі пазбегнуць многіх складаных задач пабудовы нанапрылад з нуля, а замест гэтага засяродзіліся на дабаўленні магчымасцей ва ўжо даўно зразумелыя малекулы, якімі лёгка маніпуляваць.

## ЯНЫ ПАДМЯНЯЮЦЬ ЛЮДЗЕЙ

«Робаты-гуманоіды працягнуць замяняць людзей у небяспечных прафесіях і на цяжкай працы», — лічыць японскі даследчык у галіне робататэхнікі Хіросі Ісігура. У інтэрв'ю выданню IBTimes UK інжынер заявіў, што чалавекападобныя машыны неўзабаве стануць найлепшай альтэрнатывай людзям у шэрагу прафесій, у тым ліку звязаных з шоу-бізнесам. Бо робаты, як і людзі, могуць працаваць мадэлямі, здымацца ў кіно і спяваць песні.

— Робат можа быць ім заўгодна, напрыклад поп-зоркай. Робаты-андроіды прыгожыя, яны ніколі не стамляюцца і могуць выконваць хіты без перыпынку, — сказаў Ісігура, адзначыўшы, што нестарэючыя андроіды дапамогуць нам заўсёды заставацца маладымі.



Хіросі Ісігура прыцягнуў да сябе ўсеагульную ўвагу ў 2010 годзе пасля стварэння рабатызаванай копіі самога сябе, што здольна чытаць лекцыі ва Універсітэце Осакі. Яго лабараторыя выпускае робатаў-гуманоідаў, якія амаль не адрозніваюцца ад жывых людзей.

Чалавекападобныя робаты Ісігуры маюць настолькі рэалістычную знешнасць, што іх можна прыняць за чалавека. Аднак інжынерам яшчэ трэба будзе зрабіць нямала працы, перш чым машына навучыцца думаць, як чалавек. Ва Універсітэце Осакі зараз працуюць над тым, каб надзяліць машыну эмоцыямі праз механізм намераў і жаданняў. Ісігура лічыць, што лепшае разуменне гэтых двух псіхічных станаў дапаможа яму стварыць спагадлівага робата.

— Штучны інтэлект развіваецца хуткімі тэмпамі. Мы можам навучыць робатаў рэагаваць на эмоцыі навакольных, — распавёў Ісігура.

Зрэшты, эмацыйныя машыны ўжо існуюць. Адна з такіх была прадстаўлена на выставе AsiaWorld Expo ў Ганконгу.

## ПАМОЧНІК ПА ПАКУПКАХ І АФІЦЫЯНТКА

У адным з японскіх універмагаў прадставілі жанчыну-робата, аблічча якой максімальна набліжана да чалавечага. Андроід носіць імя Айко Ціхіра і апрануты ў традыцыйнае японскае кімано. Робат нават атрымаў сваю першую працу: Айко адпраўлена ў кавярню, дзе павінна будзе вітаць гасцей і прыцягваць ва ўстанову новых наведвальнікаў.



Упершыню ўнікальная машына паўстала перад публікай у якасці шопінг-памочніка. Новая распрацоўка кампаніі Toshiba прыемным голасам вітае гасцей гандлёвага цэнтра «Міцукосі» ў Токіа і распавядае наведвальнікам, дзе можна знайсці той ці іншы тавар. Інавацыя сапраўды вельмі нагадвае жывога чалавека. У робата натуральныя на выгляд валасы, светлая скура з сілікону, рухомы твар з вачыма, якія моргаюць, вуснамі і ротам, што варушацца і адкрываюцца падчас размовы. Андроід мякка жэстыкулюе, паварочвае і нахіляе галаву. Стваральнікі адзначаюць, што з Айко прыемна кантактаваць. «Гэта робат са здольнасцю да камунікацыі», — кажа супрацоўнік аддзела распрацовак і развіцця Toshiba Тайхэ Ямагуці. На працу над Айко ў кампаніі пайшло дзесяць месяцаў. Аднак спецыялісты вырашылі не спыняцца на дасягнутым і ўзяліся за распрацоўку іншых машын.

## ТРОХІ ГЛУПСТВА

Усё ў той жа высокатэхналагічнай Японіі адзін вытворца агародніннах сокаў выпусціў робата, што корміць наўпрост на хаду. Машына разлічана на людзей, якія любяць есці і не спыняцца. Робат мацуецца на спіну карыстальніка, як звычайны заплечнік, і важыць 8 кілаграмаў. Па назве — Tomatan — і вонкавым выглядзе робата можна зразумець, што ён корміць свайго ўладальніка памідорамі, якія вывальваюцца з жалезнага рота. Паводле паведамленняў кампаніі Kagome, найбуйнейшага ў Японіі пастаўшчыка таматнага соку і кетчупу, Tomatan патрэбен удзельнікам такійскага марафону. «У памідорах змяшчаецца шмат пажыўных рэчываў, якія змагаюцца са стомленасцю», — кажа Шыгеноры Сузукі з Kagome. Tomatan з'яўляецца сумеснай працай Kagome і японскай арт-студыі Maywa Denki, добра вядомай сваімі незвычайнымі музычнымі інструментамі і іншымі прыладамі. Сузукі прадставіў Kagome на жартоўным забегу ў рамках Tokyo Marathon у пачатку 2015 года. Прадстаўнік кампаніі апрануў на сябе «таматнага» робата і прабег з ім на плячах. У інтэрнэце, зрэшты, ідэю стварэння гэтага робата называюць трызненнем. Але гэта Японія, там яшчэ і не такое бывае.




■ Дайджэст

## ВУЛКАНЫ ЯК ПАГРОЗА ЧАЛАВЕЦТВУ

**Геолагі б'юць трывогу і заклікаюць краіны свету стварыць глабальную сістэму маніторынгу, якая дазволіць адсочваць стан вулканаў і знізіць рызыку сусветнай катастрофы.**

Наймагутнейшае вывяржэнне вулкана, аналагічнае знакамітаму Тамборы ў пачатку XIX стагоддзя, можа адбыцца ў бягучым стагоддзі з верагоднасцю ў 5—10%, што прывядзе да катастрафічных наступстваў і патэнцыйнай гібелі цывілізацыі. Пра гэта пішуць еўрапейскія геолагі ў дакладзе, падрыхтаваным для Еўрапейскага навуковага фонду.



Сённа многія палеантолагі і эвалюцыяністы лічаць, што вельмі магутныя вывяржэнні вулканаў адыгрывалі ключавую ролю ў многіх масавых выміраннях жывёл і раслін. За час існавання чалавечай цывілізацыі адбылося сем дзясяць буйных вывяржэнняў, адно з якіх, выбух гары Тамбора ў 1815 годзе, знішчыла 71 000 чалавек і прывяло да прыкметнага пахаладання клімату, серыі неўраджаяў і голаду ў шэрагу краін па ўсёй Зямлі.

Амерыкана-нямецкі геолаг Ганс-Петэр Плаг і многія іншыя еўрапейскія спецыялісты па вулканалогіі паспрабавалі зразумець, наколькі небяспечныя падобныя вывяржэнні вулканаў для чалавецтва, улічваючы сяміразовую розніцу паміж насельніцтвам Зямлі XIX стагоддзя і сёння. Паводле іх ацэнак, шанцы на ўзнікненне такога катаклізму дастаткова высокія — яны складаюць 5—10% для вывяржэнняў, падобных Тамборы. Іх наступствы, на думку аўтараў даклада, будуць сапраўды катастрафічнымі, таму што чалавецтва да гэтага часу не стварыла сістэм глабальнага маніторынгу за станам вулканаў, падобных да тых сейсмічных сетак, якія сочаць за землятрусамі.

Як паказваюць разлікі вулканолагаў, калі такое вывяржэнне адбудзецца, то цывілізацыі будзе нанесены каласальны ўрон, загінуць сотні тысяч людзей, эканоміцы і прамысловасці будзе нанесена вялізная шкода. З гэтай нагоды геолагі заклікаюць урады ўсіх краін аб'яднацца і стварыць глабальную сістэму маніторынгу за станам вулканаў, якая дапаможа прыкметна знізіць лік людскіх ахвяр і эканамічных страт.

## А ВЫ БАІЦЕСЯ ПАВУКОЎ?

**Навукоўцы з Каліфарнійскага ўніверсітэта ў Санта-Барбары (ЗША) выказалі здагадку, што страх перад павукамі з'яўляецца ахоўным эвалюцыйным механізмам.**

Наша зрокавая сістэма валодае здольнасцю хутка выяўляць навакольныя пагрозы — змей, павукоў, небяспечных драпежнікаў (гэта з'яўляецца элементам так званай сітуацыйнай гатоўнасці).

Псіхолагі правялі на добраахвотніках выпрабаванне: яны пасадзілі студэнтаў за камп'ютар з простым графічным тэстам, але час ад часу ўстаўлялі ў яго на імгненне кадры з іголкай для падскурных ін'екцый, мухай і павуком. У выніку менш за 15% удзельнікаў заўважылі з'яўленне іголкі, 10% заўважылі муху, затое з'яўленне павука заўважылі больш за палову добраахвотнікаў!



Павукі-выкапні сустракаюцца ў адкладах каменнавугальнага перыяду, гэта значыць, яны існавалі 350 мільёнаў гадоў таму, задоўга да чалавека. Многія з іх былі атрутнымі і з развіццём прыматаў сталі ўяўляць для апошніх пагрозу. Прыматы выпрацавалі супраць павукоў механізм сітуацыйнай гатоўнасці (як супраць звычайных драпежнікаў або змей). Псіхалагічны тэст з'яўляецца адным з пацвярджэнняў гэтай тэорыі. Нягледзячы на тое, што сёння смяротных павукоў вакол нас не так шмат, як у далёкім мінулым, інстынктыўны страх па-ранейшаму карысны нават у сучасным грамадстве: каля 200 чалавек штогод паміраюць ад укусаў атрутных павукоў па ўсім свеце.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

# НАСТРОЙ — У ВАШЫХ... ВАЛАСАХ!

## «Алеся» вучыла рабіць прычоскі

**На нядаўняй міжнароднай спецыялізаванай выставе «СМІ ў Беларусі» ўсе выданні і каналы імкнуліся яскрава і запамінальна прадставіць свой прадукт. Рэдакцыя часопіса «Алеся» арганізавала, прынамсі, сапраўдны «жаночы майстар-клас» па цырульніцкай справе.**




Галоўнымі дзейнымі асобамі сталі супрацоўнікі салона прыгажосці «Тэатр прычосак» Святлана Шнэк і Настасся Яткова. Трапіць да такога прафесіянала, як Насця — сапраўднае, як кажуць, шчасце. Дзяўчына з'яўляецца сярэбраным прызёрам чэмпіянату свету сярод цырульнікаў і на дасягнутым спыняцца не збіраецца.

— Калі табе падабаецца тое, чым ты займаешся, усё абавязкова будзе атрымлівацца. Па-іншаму проста не бывае! Галоўнае — своечасова зразумець, дзе «тваё», а дзе «чужое», — дзеліцца сакрэтам свайго поспеху Настасся.

Тым часам каля выставачнага стэнда Выдавецкага дома «Звязда», дзе прэзентавалася і «Алеся», сабралася нямала тых, хто з цікавасцю назіраў за стварэннем шэдэўра з валасоў. Як высветлілася, тэма прыгожай прычоскі актуальна не толькі для жанчын рознага ўзросту, але і для моцнай паловы.



— І колькі гадзін яны будуць сядзець вось так нерухома? — пакazваючы на дзяўчат-мадэляў, пытаецца мужчына гадоў пяцідзесяці. — Напэўна, гэта падрыхтаваныя людзі, не першы раз ідуць на «такое»...

— Гэта звычайныя жанчыны, якія хочуць паэксперыментаваць са сваёй знешнасцю. Знаходзім мы іх праз знаёмых або сацыяльныя сеткі. Ахвотных шмат! — адказвае цырульнік-візажыст Святлана.

Акрамя прыемных кардынальных змен у знешнасці, час стварэння новай прычоскі або макіяжу дазваляе жанчынам абстрагавацца ад паўсядзённых спраў і праблем.

— У мяне маленькае дзіця, і я амаль увесь час знаходжуся з ім дома. Таму бываюць дні, калі вельмі хочацца неяк развеяцца, і роля мадэлі — гэта цудоўны варыянт! — расказвае адна з дзяўчат.

Дарэчы, самую «працяглую» ў сваёй кар'еры прычоску Святлана рабіла чатыры гадзіны. Як прызнаецца майстар, гэта было яшчэ ў самым пачатку яе кар'еры і досведу, зразумела, не хапала. Увогуле, сапраўдны майстар заўсёды разлічвае час стварэння той ці іншай прычоскі. Гэта не прымушае хваляваццa заказчыка, напрыклад, нявесту, ды і самога цырульніка.

— Мы ніколі не даём назваў прычоскам, якія робім. Кожная мэдаль — гэта новы непаўторны вобраз, і назваць усе проста нерэальна, — тлумачыць Насця. — Ёсць некалькі базавых прычосак з назвамі, і вось над імі мы фантазіруем: нешта дабаўляем, прыбіраем, змяняем.

Цырульнікі кажуць, што валасы — самае галоўнае ўпрыгажэнне чалавека. Яны характарызуюць асобу, адлюстроўваюць яе звычкі. Калі валасы прамыя — чалавек ведае, чаго хоча, мае выразную мэту, рашучы. Кучаравыя валасы — чалавек эмацыйны, запальчывы, з «шырокай душой». Правільная прычоска можа надаць асобе выразнасць, схаваць недахопы формы твару або галавы.

...Праз паўтары гадзіны нашы прычоскі былі амаль гатовы. Засталося толькі ўпрыгожыць іх бліскучымі заколкамі і прыгожымі шпількамі. Майстры цырульніцкай справы патлумачылі, што гэта адны з самых простых прычосак, якія падыдуць да дня нараджэння, вяселля або іншага свята. Што датычыцца прафесійных фотасесій або модных паказаў, то тут патрэбен іншы падыход.

— Прабачце, я сёння ў тэатр іду, — звярнулася да Насці наведвальніца выставы, жанчына гадоў шасцідзесяці. — Не маглі б вы мяне крыху прычасаць? Хочацца прыгожа выглядаць!

Насця пагадзілася зрабіць хуткую прычоску ўважлівай глядачцы, якая назірала за працай майстра з самага пачатку. Але найперш — макіяж мадэлям! Так, на прычосках прафесіяналы не спыняюцца. Кожны цырульнік абавязкова павінен умець рабіць макіяж. Гэта дапамагае больш выразна падаць прычоску і зрабіць вобраз цалкам завершаным.

— У салоне мы ставім сапраўдныя тэатральныя пастановы! Галоўныя ролі выконваюць нашы кліенты. Мы эксперыментуем, шукаем нешта новае і незвычайнае! Нікога сёння ўжо не здзівіш добра прычасанымі валасамі або яркімі вуснамі. Але ўсё гэта павінна пра нешта казаць, несці нейкую ідэю, — гаворыць Святлана.

Макіяж і прычоскі зроблены. Мадэлямі-прыгажунямі любаваліся ўсе, хто праходзіў каля нашага выставачнага стэнда. Дарэчы, навучыцца рамяству як цырульніка, так і візажыста ў салоне прыгажосці «Тэатр прычосак» могуць усе ахвотныя. У гэтай справе няма ніякіх абмежаванняў! Узрост, прафесія і вашы інтарэсы не маюць значэння. Галоўнае — жаданне. І, як кажуць прафесіяналы, кожная жанчына павінна ўмець прывесці сябе ў парадак! І рабіць гэта трэба свядома, з веданнем справы.

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**



Фота Надзеі БУЖАН.

---

## Азбука народнай культуры

### ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

Рэчы штодзённыя («абыдзённыя») — такую назву атрымалі рэчы, якія ўдзельнічалі ў рытуальных дзеяннях і выконвалі функцыю аховы ад хвароб, нячыстай сілы, стыхійных бедстваў. Галоўнай умовай іх вырабу быў пэўны часовы прамежак: ад усходу да захаду, ад захаду да ўсходу, радзей — на працягу сутак. Завяршаюць усяго працэсу вырабу рэчы ў тэрмін «аднаго сонца» надзяляла гэтую рэч магічнай і звышнатуральнай сілай.

◈ Да «абыдзённых» рэчаў адносілі перш за ўсё палатно (холст, ручнік, пояс, кашулю). Каб сатткаць палатно, з якога потым будуць зроблены рытуальныя рэчы, па папярэдняй дамоўленасці ў пэўнай хаце збіраліся жанчыны. Звычайна ў гэтым абрадзе ўдзельнічалі толькі «чыстыя» жанчыны: удовы, цнатлівыя дзяўчаты ці зусім сталыя жанчыны, якія спынілі сваё інтымнае жыццё. Яны ж прыносілі воўну, лён. Талака ў такой справе таксама была адной з умоў стварэння «абыдзённай рэчы».

◈ Абыдзённае палатно магло стаць ахвяраваннем для царквы. Для таго, каб перасцерагчы сябе і сваякоў ад эпідэміі, жанчыны на світанні «апаясвалі» царкву абыдзённым палатном. Пасля гэтага яго пакідалі ў храме ці аддавалі вандроўнікам, нямоглым, бедным, якія збіраліся вакол храма.

◈ З той жа нагоды абыдзённае палатно рэзалі на невялікія часткі і вешалі на варотах па ўсёй вёсцы.

◈ Часам рытуальныя дзеянні жанчын суправаджаліся рытуальнымі дзеяннямі мужчын. Пакуль жанчыны ткалі абыдзённік, мужчыны рабілі абыдзённы крыж, які пасля ставілі на ўскрайку вёскі, і вешалі на яго ручнік. Такія сумесныя дзеянні выконвалі, каб спыніць шматлікія смерці і пахаванні ў вёсцы, што былі выкліканы эпідэміяй, вайной, ці ў барацьбе з засухай, паводкай і г.д.

---

## Спорт-тайм

# З НЯБЁСАЎ — НА ЗЯМЛЮ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязда» распавядае пра сенсацыйную перамогу беларускіх хакеістаў і іх не менш гучнае паражэнне, чарговы футбольны тур чэмпіянату краіны і трыумф брэсцкіх гандбалістаў.**

**1. Безумоўна, самай яркай падзеяй спартыўнага тыдня ў Беларусі стала перамога хакеістаў нашай зборнай над амерыканцамі** на чэмпіянаце свету ў Чэхіі. Падапечныя Дэйва Льюіса ўпершыню ў гісторыі беларускага хакея адолелі зборную ЗША, ды яшчэ і з разгромным лікам 5:2.

Аднак у эйфарыі беларускім хлопцам доўга знаходзіцца не прыйшлося. Услед за гучнай перамогай адбылося правал. У наступным матчы з дзейнымі чэмпіёнамі свету — зборнай Расіі — беларускія хакеісты саступілі 0:7. Галоўны трэнер беларусаў не стаў крытыкаваць хакеістаў: «Перыядычна прайграюць усе, у тым ліку і з буйным лікам, ніхто ад гэтага не застрахаваны. Пытанне ў тым, як на гэта рэагаваць. Трэба ўмець трымаць удар. Мы ўсё яшчэ ў барацьбе».

Калі вярстаўся нумар. Учора беларуская зборная сустракалася з сярэбраным прызёрам леташняга чэмпіянату свету зборнай Фінляндыі. За два перыяды каманды галоў не забілі, а ў трэцім выдалі вельмі вострую і цікавую гульню, забіўшы па дзве шайбы, прычым беларусы зраўнялі лік на апошняй хвіліне матча. Авертайм галоў не прынёс, а ў серыі паслheader матчавых булітаў беларусы, на жаль, саступілі. Тым не менш наша каманда зарабіла адзін бал і па-ранейшаму засталася на чацвёртым радку групы В. Сёння — рашаючы матч са зборнай Нарвегіі.

**2. Тым часам прыходзяць першыя весткі аб пераходах беларускіх гульцоў у КХЛ.** Клубную прапіску памянялі Андрэй Стась і Аляксандр Кітараў — у наступным сезоне яны будуць выступаць за «Нафтахімік». Мінскае «Дынама» не стала працягваць пагадненне з беларускім абаронцам Ільёй Шынкевічам, ён адправіцца ў падмаскоўны «Віцязь». Уладзімір Дзянісаў застаецца ў «Ак Барсе», а ў сталічным «Дынама» з'яўляюцца першыя навічкі. Беларускі клуб заключыў кантракты з 29-гадовым канадскім варатаром Джэфам Гласам і амерыканскім абаронцам Раянам Гундэрсанам.

**3. БГК імя Мяшкова заваяваў Кубак Беларусі.** Фінал з мінскім СКА выдаўся драматычным. Асноўны час сустрэчы завяршыўся ўнічыю — 29:29. Прычым брастаўчане зраўнялі лік за чатыры секунды да фінальнага свістка, для выяўлення пераможцы сапернікам спатрэбіўся авертайм. Такім чынам, брэсцкія гандбалісты другі раз запар выйгралі Кубак Беларусі.

**4. У нядзелю стартаваў 5-ы тур чэмпіянату краіны па футболе.** «Шахцёр» на сваім полі абыграў «Нёман», чэмпіён БАТЭ з мінімальным лікам адолеў «Белшыну», а брэсцкае «Дынама», якое добра пачало сезон, саступіла ў Наваполацку. «Гомель» не змог абыграць на выездзе жодзінскіх аўтазаводцаў, навічкі найвышэйшай лігі «Граніт» і «Слівія» згулялі з лікам 3:2.

Адзначым таксама, што на мінулым тыдні мінскае «Дынама», «Шахцёр» і «Тарпеда»-БелАЗ атрымалі ліцэнзіі УЕФА на сезон-2015/16.

**5. Вікторыя Азаранка не змагла абыграць першую ракетку свету** Серэну Уільямс у трэцім раўндзе турніру ВТА у Мадрыдзе. Беларуска ў трох сэтах саступіла амерыканцы 6:7 (5:7), 6:3, 6:7 (1:7). Пераможцай турніру стала чэшка Петра Квітава, у фінальным паядынку яна была мацнейшая за расіянку Святлану Кузняцову.

**6. Аляксандр Сыман прызначаны старшым трэнерам мужчынскай зборнай па біятлоне.** Алег Рыжанкоў, які займаў гэты пост у мінулым сезоне, узначаліў маладзёжную каманду. З ім у пары будзе працаваць Сяргей Сакалоўскі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

---

## Погляд балельшчыка

# «САКРАЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ» ЦІ «ЛЫЖКА ДЗЁГЦЮ»?

**«Зборная Расіі выйграла 7:0 да 70-годдзя Перамогі», «Расійскі парад Перамогі», «Сухі разгром працяўніка расіян 9 мая» — гэта загалоўкі ў некаторых расійскіх СМІ пасля перамогі над беларусамі на чэмпіянаце свету па хакеі ў Чэхіі. Калегі ў эйфарыі, быццам гэта не спартыўныя спаборніцтвы, а фронт, дзе расіяне змагаюцца са сваім ворагам.**

Да такога «патрыятычнага» настрою пасля, безумоўна, перакanaўчай і заслужанай перамогі над беларусамі далучыўся і капітан расійскай каманды Ілья Кавальчук, які пасля матча зазначыў «сімвалічнасць» выйгрышу менавіта з лікам 7:0 у дзень 70-годдзя Перамогі над фашызмам. У адным з каментарыяў гэтыя лічбы называюцца нават сакральнымі. У іншым — выказваецца меркаванне, «што такі прыгожы лік да канца сустрэчы псаваць ужо не хацелася, хаця і нельга сказаць, што зборная Расіі не магла забіць яшчэ». І ў выніку, маўляў, атрымалася тая ж лічба, якую паказалі ў маскоўскім небе самалёты падчас парада Перамогі.

Дарэчы, гэтая «сакральнасць», мяркуючы па інфармацыі з інтэрнэту, камусьці ўбачылася не толькі пасля перамогі расіян над беларускай зборнай. Юбілею Перамогі ў Маскве прысвяцілі турнір дзіцячых каманд, і ў фінале масквічы абыгралі сваіх равеснікаў з Казані таксама з лікам 7:0. Вось ацэнка: «Выдатны вынік напярэдадні 70-годдзя Перамогі».

Мне, звычайнаму балельшчыку, дагэтуль здавалася (і працягваю так лічыць), што спорт, у тым ліку і хакей, — гэта саперніцтва ў майстэрстве гульцоў, закінутыя і прапушчаныя шайбы, радасць перамогаў і горыч паражэнняў. І нічога іншага. Ніякай прывязкі да нейкіх знакавых дат, а тым больш — звязаных з Вялікай Айчыннай вайной. Крыўдна, што падыход да спартыўных спаборніцтваў можа быць і іншым.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

---


«Дзякуй за Перамогу!»

Гэтыя запаветныя словы хацелася б сказаць найперш нашым ветэранам, а заадно пажадаць ім шчасця, мірнага неба над галавой, па магчымасці — актыўнага ладу жыцця па выхаванні нашай моладзі ў імя светлай будучыні. Усім, хто побач з намі, — таксама святочнага настрою, упэўненасці ў заўтрашнім дні, здароўя і даўгалецця.

*З павагай, рэктар установы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт», старшыня Брэсцкай абласной арганізацыі ГА «Белая Русь» Пятро ПОЙТА.*

УНП 200002511

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Стародорожский механический завод» (продавец) проводит повторный открытый аукцион**

## по продаже здания насосной станции,

